Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

14 ЛІПЕНЯ 2007 г. СУБОТА

№ 130 (25995)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

ПРАЦОЎНЫЯ ПЫТАННІ. З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Новы варыянт Працоўнага кодэкса, кантракты і водпускі, асаблівасці працы жанчын і інвалідаў, рэжым работы і іншыя «прыватныя» пытанні — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Інэсы Мечыславаўны ЧЫСЦЯКОВАЙ.**

Такім чынам, УВАГА! Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, «прамая лінія» будзе праходзіць **з 11 да 12 гадзін 19 ліпеня па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292-38-21 і 292-38-92. Адначасова папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287-17-57.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

ПУСК ТРУБАПРАКАТНАГА КОМПЛЕКСУ БМЗ — ВАЖКІ ЎКЛАД У РУХ БЕЛАРУСІ ДА ПРАГРЭСІЎНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі адкрыцця вытворчасці бясшвовых гарачакачаных труб на БМЗ.



Фота БЕЛТА.

Паводле яго слоў, комплекс спраектаваны, пабудаваны і аснашчаны па апошняму слову тэхнікі ў рэкордна кароткія тэрміны — за 2,5 года. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў канцы 2004 года ім была пастаўлена стратэгічная задача аб пераводзе БМЗ на больш высокую ступень як па асартыменту выпускаемай прадукцыі, так і па глыбіні перапрацоўкі сыравіны.

«Штогод тут плануецца выпускаць да 250 тыс. тон гарачакачаных бясшвовых труб самага шырокага спектра прымянення — ад камунальнай гаспадаркі да нафта- і газаздабыўной прамысловасці. Гэта дасць магчымасць зменшыць, а па шэрагу пазіцый поўнасцю выключыць залежнасць ад паставак гэтай прадукцыі па імпарту», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што новая вытворчасць укамплектавана кадрамі, і яе стварэнне дало магчымасць арганізаваць каля 500 рабочых месцаў. Персанал прайшоў практычнае навучанне на заводах Расіі, Украіны, Германіі, Італіі і Кітая.

У праектаванні, вырабе і мантажы абсталявання новай вытворчасці прымалі актыўны ўдзел беларускія станкабудаўнічыя заводы.

Аляксандр Лукашэнка станоўча ацаніў і той факт, што разам з будаўніцтвам новага комплексу і паспяховым выкананнем напружаных вытворчых планаў БМЗ таксама вялікую ўвагу ўдзяляе сацыяльным пытанням. Паспяхова выконваецца дзяржаўная жыллёвая праграма. Так, за апошнія паўтара года завод інвеставаў у будаўніцтва жылля амаль Br7,5 млрд. Каля Br7 млрд укладзена ў набыццё сучаснага медыцынскага абсталявання для заводскай паліклінікі.

Прэзідэнт павіншаваў работнікаў прадпрыемства з надыходзячым прафесійным святам — Днём металурга і пажадаў ім далейшых працоўных поспехаў.

«Наша плённае супрацоўніцтва ў вырашэнні канкрэтнай задачы з'яўляецца лепшым адказам тым непрыяцелям Беларусі, якія адмаўляюць саму магчымасць такога ўзаемадзеяння. Мы цэнім вашы добрыя адносіны да нас і спадзяёмся на далейшае пашырэнне і паглыбленне ўзаемавыгадных дзелавых кантактаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да кіраўнікоў замежных кампаній, якія прысутнічалі на цырымоніі.

Паводле слоў Прэзідэнта, сёння відавочна правільнасць прынятага ў свой час кіраўніцтвам краіны рашэння аб захаванні ў Беларусі важнейшых вытворчасцяў. «А быў час, калі прыхільнікаў такой пазіцыі было няшмат. Калі ўсё ішло з малатка на постсавецкай прасторы і ў многіх краінах прыватызацыя прыняла крымінальны характар, я бачыў жаданне людзей, аб'яднаўшыся разам, выратаваць нашы вытворчасці. Мы пайшлі сваім шляхам, і дзякуючы гэтаму нам удалося выратаваць і вывесці на высокі ўзровень БМЗ і многія іншыя прадпрыемствы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, цяпер трэба больш увагі ўдзяляць мадэрнізацыі існуючых вытворчасцяў, а не будаўніцтву новых. «Калі і будаваць новыя заводы, дык толькі пад існуючую сыравіну, як, напрыклад, Шклоўскі завод газетнай паперы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, у сувязі з пытаннямі энергетычнай бяспекі, пастаўкамі вуглевадародаў сыравіны праз Беларусь у еўрапейскія краіны значнасць нашай краіны для Еўропы ў энергетычнай сферы будзе ўзрастаць. «Я ў гэтым проста перакананы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У супрацоўніцтве з ЕС кіраўнік дзяржавы лічыць важным канцэнтраваць увагу менавіта на пытаннях энергетычнай бяспекі. «Калі нам еўрапейцы пачынаюць прапаноўваць нейкую пакрокавую стратэгію, супрацоўніцтва, і ўсё гэта схіляецца ў палітычную галіну — маўляў, у нас не тое заканадаўства і гэтак далей, мы ім кажам: што, у нас няма прадметных тэм для супрацоўніцтва? Або еўрапейцы ўжо зацыкліліся настолькі, што не бачаць галоўных праблем?» — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што цяпер Беларусь адыгрывае важную ролю ў стварэнні бар'ера для наркатрафіку, незаконнага гандлю зброяй. «Нямала мы тут працуем на ЕС, у тым ліку і ў энергетычнай бяспецы», — дадаў Прэзідэнт.

Беларусь мае намер удзельнічаць у будаўніцтве аб'ектаў напярэдадні Алімпіяды-2014 у Сочы.

«Алімпіяда — гэта вялікі падарунак і для Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Па-першае, у Сочы пабудаваны беларускі фізкультурна-спартыўны цэнтр. Па-другое, тое, што Беларусь будзе ўдзельнічаць у будаўніцтве аб'ектаў у Сочы перад Алімпіядай, не выклікае абсалютна ніякага сумнення, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы дадаў, што беларускі бок мае намер прадоўжыць будаўніцтва фізкультурна-спартыўнага цэнтра ў Сочы. «У бліжэйшы час мы сустрэнемся з прэзідэнтам Расіі, і я папрашу, каб нам пашырылі плошчы. Гэта цудоўнае месца, адно з найпрыгажэйшых у свеце, і тут будзе добрая аддача», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі не супраць, каб яго імя выкарыстоўвалі ў палітычных кампаніях у Расіі.

«Гэта сведчыць аб тым, што ваш Прэзідэнт карыстаецца вялікім аўтарытэтам за мяжой», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Калі гэта на карысць Беларусі, а лічу, што не на шкоду, няхай выкарыстоўваюць», — дадаў ён.

Прэзідэнту ЗША Джорджу Бушу трэба разбірацца са сваімі праблемамі: Іракам, іншымі гарачымі пунктамі, якія яны (ЗША. — **Заўвага БЕЛТА**) стварылі, і менш звяртаць увагі на тыя краіны, дзе яны спрабуюць падтрымліваць апазіцыю.

«У яго (Джорджа Буша) праблем значна больш, чым у нас. Ёсць куды накіроўваць грошы — інфляцыя долара прыняла страшныя памеры», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Гаворачы пра фінансавую дапамогу, што паступае няўрадавым арганізацыям Беларусі з-за мяжы, Прэзідэнт падкрэсліў: «Гэта інвестыцыі ў краіну, але яны павінны быць законнымі». «У выпадку незаконных дзеянняў гэтыя арганізацыі будуць неадкладна закрыты. Той, хто незаконна ўвязе ў Беларусь грошы, на гэтых грашах сябе і загубіць», — дадаў ён.

БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РАНІШНЯЯ ПЛАНЁРКА

Фота зроблена ля шашы Віцебск—Полацк у Шумілінскім раёне.

ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Французскай Рэспублікі Нікаля Сарказі з нацыянальным святам — Днём узяцця Бастыліі.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што развіццё сяброўскіх беларуска-французскіх адносінаў адказвае інтарэсам народаў дзвюх краін.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БЕЛАРУСЬ І ФРАНЦЫЯ

яшчэ «дрэнна ведаюць» адна адну

Беларусь і Францыя, якіх гісторыя не так шмат звязвала на працягу апошніх стагоддзяў, сёння мала ведаюць адна адну. Пра гэта заявіла ўчора на прэс-канферэнцыі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Французскай Рэспублікі ў Беларусі Мірэй Мюсо.

Паводле яе слоў, французы «адкрылі для сябе Беларусь» толькі тры гады таму, у момант пашырэння Еўрапейскага саюза на Усход. «Не так шмат часу, каб у нас ўсталяваліся глыбокія сувязі». Разам з тым жыхары Беларусі «не так добра інфармаваныя аб развіцці французскай культуры і навукі, аб эканамічнай вазе краіны, значнай ролі, якую яна адыгрывае ў найважнейшых сусветных палітычных справах...»

Сваю задачу на бліжэйшыя гады пасол Францыі бачыць у тым, каб з дапамогай пасла Беларусі ў Парыжы «развіваць эканамічныя абмены» паміж дзвюма краінамі. «З 2000 года яны выраслі, але яшчэ застаюцца дастаткова слабымі».

Пасол таксама выказала пажаданне аб пашырэнні ўзаемнага знаёмства з культурамі дзвюх краін. «Я шчаслівая, што паміж універсітэтамі Францыі і Беларусі існуюць адносіны, студэнты сустракаюцца і наведваюць нашы краіны». Пасол дадала, што жадае таксама развіцця «партнёрскіх адносінаў» французскага боку з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Гаворачы пра магчымае супрацоўніцтва беларускага боку з Францыяй пры будаўніцтве АЭС у нашай краіне, пасол адзначыла, што пэўны час таму беларускія ўлады накіроўвалі дэлегацыі ў розныя краіны, якія маюць АЭС, з мэтаю вывучэння іх вопыту ў сферы ядзернай энергетыкі. Напрыканцы 2006 года такая дэлегацыя наведала і Францыю.

«Дэлегацыя наведала атамную станцыю, а таксама мела магчымасць пагутарыць з прадстаўнікамі арганізацый, якія працуюць у сферы атамнай энергетыкі». У прыватнасці, беларуская дэлегацыя правяла перамовы з прадстаўнікамі кампаніі «Areva».

Гаворачы пра згоду Беларусі адчыніць прадстаўніцтва Еўракамісіі, Мірэй Мюсо заявіла, што гэта «можна назваць крокам у адказ» на тое, што ўжо шмат гадоў існуе прадстаўніцтва Беларусі пры Еўрапейскім саюзе ў Бруселі. «Мы вельмі спадзяёмся, што наяўнасць прадстаўніцтва ў Беларусі дапаможа больш эфектыўна развіваць нашы адносіны».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

БЛІЖЭЙ ДА ЗОР

У Беларусі будзе новы касмічны апарат

Адпаведны кантракт аб яго стварэнні быў падпісаны днямі ў Нацыянальнай акадэміі навук беларускімі навукоўцамі з расійскім профільным прадпрыемствам Роскосмаса.

Як паведаміў на ўрачыстай цырымоніі падпісання старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Міхаіл Мясніковіч, беларуская касманаўтыка выйшла на новы этап свайго развіцця. Згодна з указам кіраўніка дзяржавы, увесь комплекс падрыхтоўчых работ у гэтым накірунку ўжо завершаны, вучоныя Беларусі і Расіі адпрацавалі неабходны пакет дакументаў. Гаворачы пра новы беларускі касмічны комплекс дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што гэта будзе не толькі касмічны апарат. Ствараецца прынцыпова новая сістэма ў цэлым: і сам апарат, і наземны комплекс кіравання. У адрозненне ад апарата «БелКА» гэта будзе незалежная работа, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Мяркуецца, што наш новы апарат будзе больш манеўраным, чым папярэдні, больш эфектыўным у эксплуатацыі і ўдвая лягчэйшым. Акрамя таго, ён будзе адпавядаць усім міжнародным стандартам аналагічных спадарожнікаў. У самой Расіі пакуль няма такога апарата.

Зараз падпісана і ўжо дзейнічае пагадненне паміж Нацыянальнай акадэміяй навук і Роскосмасам, дзе абодва бакі ўзялі на сябе абавязкі спрыяць рэалізацыі гэтага праекта ў поўным аб'ёме.

Пры стварэнні апарата «БелКА» меркавалася, што прыём будзе здзяйсняцца беларускім бокам, а перадача — праз Цэнтр кіравання палётамі Расіі. Зараз усё будзе выпрашацца аўтаномна самой Беларуссю: і перадача, і прыём інфармацыі без прыцягнення расійскай інфраструктуры.

Згодна з праектам, запуск беларускага касмічнага апарата запланаваны на чацвёрты квартал 2009 года. Ён будзе адпраўлены адным ракетаносьбітам разам з расійскім аналагам — «Канобусам-В». Пасля правядзення іспытаў абодва спадарожнікі пачнуць працаваць у агульнай касмічнай сістэме. Гэта ўдвая павялічыць эканамічны эфект нашага апарата.

Інга МІНДАЛЁВА.

Генадзь НЯВЫГЛАС:

«Чалавек не павінен быць просьбітам, а чыноўнік — князем у сваім кабінеце»

Учора ў Брэсцкім аблвыканкаме адбыўся семінар-нарада, якую правёў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Генадзь Нявыглас з ідэалагічным актывам Брэстчыны.

Ва ўсіх 235 пасялковых і сельскіх выканкамах вобласці ўстаноўлены камп'ютары, забяспечана сувязь паміж электроннымі сістэмамі органаў дзяржаўнага кіравання, паспяхова рэалізуецца праграма «Аўтаматызаваная сістэма «Сельсавет» і «Аўтаматызаваная сістэма «ЗАГС». У агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнаму кадастру дзейнічаюць аўтаматызаваныя сістэмы рэгістрацыі нерухомай маёмасці, электронны абмен дакументамі з натарыяльнымі канторамі і «Беларусбанкам». Зараз ва ўсіх МРЭА ДАІ вобласці маецца ўвесь комплекс паслуг, які дазволіў паспяхова наблізіцца да вырашэння праблемы вялікіх чэргаў пры рэгістрацыі аўтамабіляў, уведзена сістэма «аднаго акна», таксама з'явілася магчымасць рэгістрацыі аўтамабільных сродкаў без асабістай прысутнасці іх уласнікаў у МРЭА ДАІ. Выкарыстанне сістэмы «Электронная рэгістратура» ў паліклініцы № 6 г. Брэста, цэнтральнай паліклініцы Пінска таксама дазволіла паспяхова змагацца з узнікненнем чэргаў: запіс да ўрача-спецыяліста можна зрабіць за 10 дзён.

Паводле слоў Г. Нявыгласа, сацыялагічныя апытанні, праведзеныя ў вобласці, паказваюць, што яшчэ не ўсе чыноўнікі ў рэгіёне па-сапраўднаму разумеюць важнасць падыходу да разумення рэалізацыі прынцыпаў «аднаго акна», што ў многіх месцах узнікаюць чэргі, у інстанцыях праяўляюцца чыноўнікамі элементы валакіты і фармалізму.

— Людзі не павінны хадзіць месяцамі за даведкамі. Чалавек не павінен быць просьбітам, а чыноўнік — князем у сваім кабінеце, — сказаў Г. Нявыглас.

Валакіту, фармалізм і бюракратыю кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта назваў «сацыяльным злом». «Толькі ўменне чыноўніка паставіць сябе на месца простага грамадзяніна дазволіць нам справіцца з гэтай бядой», — упэўнены Генадзь Мікалаевіч. Ён таксама звярнуў увагу на недасканаласць інфармавання насельніцтва на стэндах у некаторых установах. Многія матэрыялы, якія там вывешаны, надрукаваны дробным шрыфтам, а то і проста састарэлыя.

Увядзенне кніг заўваг і прапаноў Г. Нявыглас ахарактарызаваў як аператыўную форму ведання патрабаванняў насельніцтва.

На нарадзе ў Брэсце таксама ішла гаворка і аб удасканаленні ідэалагічнай работы на сучасным этапе. Наогул, ідэалогію Г. Нявыглас лічыць «кансалідуючым фактарам нашага грамадства». «Станаўленне ідэалагічнай вертыкалі на Брэстчыне адбылося, — заявіў ён. — Час даказаў яе актуальнасць і перспектыўнасць. У Брэсцкай вобласці вялікі патэнцыял ідэалагічных кадраў, галоўнае зараз — вызначыць прыярытэты ў іх працы». Адным з адмоўных фактараў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта назваў адсутнасць вышэйшай адукацыі ў часткі ідэалагічнага актыву. «Мы не дзейнічаем па аднаму ўзору. Ідэалагічнаму актыву трэба праяўляць больш творчай ініцыятывы ў рабоце, добра разумець спецыфіку рэгіёна, дзе ён працуе», — адзначыў Г. Нявыглас.

Ірына ПРЫМАК.

ЧЫГУНАЧНЫ БІЛЕТ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

Цяпер і ў Беларусі любы чалавек, адкрыўшы карпаратыўны сайт Беларускай чыгункі, можа загадзя (за 45 сутак) заказаць чыгуначны білет на той ці іншы накірунак у неабходную краіну СНД або Балтыі. Гэтая паслуга была ўведзена беларускімі чыгуначнікамі 18 мая 2007 года. Як паведаміў нашай газеце начальнік аддзела сэрвіснага абслугоўвання пасажыраў пасажырскай службы БЧ Андрэй Кашко, штодзень на чыгуначны сайт па пытаннях набыцця білетаў звяртаецца каля 300—350 чалавек. І іх колькасць з кожным днём расце. Вырашаць пытанні набыцця праязнога дакумента праз Інтэрнэт, седзячы ў зручным крэсле перад маніторам, больш прыемна, чым стаяць у чэргах перад чыгуначнымі касамі.

Таццяна ПЯТРОЎСКАЯ.

ДА СУСТРЭЧЫ, ВІЦЕБСК!

Фестываль учора афіцыйна закрыўся, і абсалютная большасць яго гасцей раз'ехалася па сваіх далёкіх ці блізкіх краінах — а сёлета, нагадаем, у «Славянскім базары» іх удзельнічала 32. Праўда, сёння ўвечары адбудзецца яшчэ канцэрт Барыса Маісеева «Шчасце на дваіх». Раней у ім была заяўлена таксама спявачка Ларыса Доліна, але ад выступлення яна адмовілася, так што дзяліць шчасце «простаму магілёўскаму хлопчыку» давядзецца з Ядвігай Паплаўскай і Алесяй. Астатнія пляцоўкі ўжо згорнутыя: асірацела без публікі плошча Свабоды, апусцеў і ператварыўся ў звычайны гарадскі парк Горад майстроў, упрыгожыўся новымі афішамі Дом кіно. Але ўсё гэта засталося ў памяці і віцябчан, і ўдзельнікаў XVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», і гасцей. Цэлы год у чаканні наступнага фэсту будуць пераказвацца і абрастаць падрабязнасцямі фестывальныя казусы і легенды. Мы склалі з іх своеасаблівы рэйтынг.

Самы запатрабаваны артыст (беларускі)

Мяркуючы па колькасці канцэртаў, гэта Андрэй Кунец. Паралельна з удзелам у дзіцячым музычным конкурсе маленькі артыст выходзіў на сцэну яшчэ 5 разоў. І толькі пасля гэтага строгі педагог — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра мастацтваў імя У. Мулявіна Святлана Стацэнка — дазволіла юнаму спеваку наладзіць «свята страўніка» і наесціся марожанага.

Самы рызыкоўны нумар

Хто б мог падумаць, што адпрацаваная да аўтаматызму, выверэная да апошняга руху і дзесяткі разоў прадстаўленая гледачам розных краін пастаноўка нумара можа даць збой! На канцэрце зорак «Еўрабачання» падчас выхаду Дзмітрыя Калдуна ў феерверкі няправільна ўставілі гільзу, і сноп іскраў шыбануў проста ў бок палатняных экранаў, за якімі знаходзіліся танцоры, ледзьве не абпаліўшы аднаму з хлопцаў твар.

Самая маштабная пакупка

Нават калі артысты ў адзін голас сцвярджаюць, што ў іх зусім няма часу, сякі-такі сувенір набыць паспяваюць. Але Надзея Бабкіна сёлета пераплюнула ўсіх — у горадзе майстроў яна прыкупіла... ні многа ні мала, а 25 гаршкоў! Як патлумачыла пазней — гэта для пастаноўкі новага мюзікла, заказвала спецыяльна ў знаёмага беларускага майстра.

Самая небяспечная дарога

Прадзюсар і спявачка Настасся Ціхановіч, якая выступіла на фестывалі ў ролі вядучай, вымушана была змяніць прычоску і выбіраць сукенкі з доўгімі рукавамі, каб замаскіраваць сінякі. Па дарозе ў Віцебск яна разам з прадзюсарам Белтэлерадыёкампаніі Дзмітрыем Баранавым і яшчэ некалькімі гасцямі трапіла ў аўтамабільную аварыю. Пайшоўшы на абгон фуры, «Таёта» прадзюсара ледзьве не сутыкнулася на сустрэчнай паласе з іншым аўто, некалькі разоў перакулілася і скончыла свой шлях у рацэ. Дзякаваць Богу, з людзьмі ўсё абышлося, а вось машына — аднаўленню не падлягае.

Самы трапны жарт з артыста

На сваім «сольніку» Алег Міцяеў па традыцыі збіраў і зачытваў запіскі ад гледачоў. Разгарнуўшы адну з іх, Алег літаральна спаў з твару: «Дзякуй Вам за сына...». Але дачытаўшы да канца, супакоіўся: аказваецца, віцябчанка дзякавала артысту за песні — пад адну з іх быў зачаты яе сын, а зараз сямейства спадзяецца на дачку. «Ну і напалохалі вы мяне — апошні раз я быў у Віцебску гадоў 7 ці 8 таму, ці мала што», — з палёгкай рассмяяўся Міцяеў.

Самая разняволеная зорка

Ёй аказалася Патрысія Каас, якая на прэс-канферэнцыі дэманстравала журналістам свае фіялетавыя туфлі як частку іміджу, а таксама «выводзіла» ў свет любімую сабаку Тэклу. Пад занавес фестывалю частку славы французскай спявачкі перацягнула на сябе Элеанора Язерская, якая прыбыла з белым катом Рамэа, называла яго «Раман Аркадзьевіч» і сцвярджала, што той больш за ўсё любіць даўганогіх бландзінак (чалавечага роду). «Гэта наш адказ Патрысіі», задаволена канстатавала Элеанора, фатаграфуючыся з пушыстым улюбёнцам.

Самая сціплая зорка

Народны артыст Беларусі Уладзімір Гасцюхін, які цярпліва стаяў у агульнай чарзе ў арт-кафэ, абсалютна нічым не выдаючы ні афіцыянтам, ні маладзенькім дзяўчатам і хлопцам з розных танцавальных калектываў, свайго «зорнага» статусу.

Можна было б яшчэ многа пералічваць самых, самых — цікавых момантаў на фестывалі хапала. Але прыгадаем лепш радкі з песні, якія гучалі ў фінале ад студыі «Гран-пры» і якія часцей за ўсё паўтаралі госці «Славянскага базару»: «Мы вернемся, абавязкова вернемся...». Бывай, Віцебск! Да сустрэчы налета!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БЕРАЗОЎСКАГА ШУКАЕ ЦЯПЕР І БРАЗІЛІЯ

Суд Бразіліі выдаў ордэр на арышт Барыса Беразоўскага, аналагічныя праблемы чакаюць бізнэсмена і ў іншых краінах, сцвярджае агенцтва «Інтэрфакс». У Бразіліі расійскага алігарха падазраюць у махінацыях пры фінансаванні вядомага футбольнага клуба «Карынтыянс» з Сан-Паўлу. Паводле звестак следства, створаная пры яго ўдзеле інвестыцыйная група MCI займалася незаконнымі фінансавымі аперацыямі і адмываннем грошай пры фінансаванні клуба.

Як сцвярджае інфарматар агенцтва, гэта — толькі пачатак. Санкцыю на арышт прадпрымальніка могуць выдаць суды адразу некалькіх замежных краін. «Ордэр на арышт Беразоўскага, выдадзены бразільскім судом, — гэта толькі першы крок. У бліжэйшы час падобныя меры будуць прадпрынятыя і шэрагам іншых краін, дзе да прадпрымальніка таксама маюцца прэтэнзіі. Крыніца не стала ўдакладняць, якія менавіта краіны могуць пайсці па шляху Бразіліі, сказаўшы толькі, што гэта — «дзве-тры еўрапейскія дзяржавы». Яна нагадала таксама, што праваахоўныя органы розных краін зараз вельмі «шчыльна і актыўна супрацоўнічаюць па пытаннях барацьбы з арганізаванай злачыннасцю і адмываннем грошай сумнеўнага паходжання».

Нагадаем, што да апошняга часу выдачы Беразоўскага для суда ад Брытаніі (дзе ён мае статус палітычнага ўцекача) дабівалася толькі Расія. Але нават самыя гучныя заявы алігарха аб падрыхтоўцы да звяржэння існуючай улады ў Расіі не зрабілі ўражання на брытанскае правасуддзе.

КАНГРЭСМЕНЫ ПРАГАЛАСАВАЛІ ЗА ВЫВАД АМЕРЫКАНСКІХ ВОЙСКАЎ З ІРАКА

Палата прадстаўнікоў амерыканскага кангрэса прагаласавала за вывад амерыканскіх войскаў з Ірака да 1 красавіка 2008 года. За гэты законапраект прагаласавалі 223 члены палаты, у якой большасць месцаў належыць дэмакратычнай партыі, 201 выказаўся супраць.

Міністр абароны ЗША абавязаны пачаць скарачэнне колькасці ўзброеных сіл ЗША ў Іраку не пазней чым праз 120 дзён пасля даты прыняцця акта, і абавязаны завяршыць скарачэнне і пераход да абмежаванай прысутнасці амерыканскіх узброеных сіл у Іраку не пазней за 1 красавіка 2008 года. За паўтары гадзіны да пачатку абмеркавання гэтага законапраекта прэзідэнт Джордж Буш на прэс-канферэнцыі ў Белым доме заявіў, што накладзе вета на любы дакумент кангрэса аб выводзе амерыканскіх войскаў з Ірака, перадае РІА «Навіны».

САМАЕ ВЫСОКАЕ ВЯСЕЛЛЕ



Самы высокі чалавек у свеце жаніўся на жанчыне, рост якой складае дзве трэці яго роста. Вяселле прайшло ў горадзе Эрдас, дзе, паводле адной з версій, знаходзіцца магіла Чынгісхана, і было арганізавана па традыцыйнаму мангольскаму абраду XIII стагоддзя.

Жыхар аўтаномнага раёна Унутраная Манголія Бао Сішунь, якому 56 гадоў (ён мае два метры 36 сантыметраў росту), сустрэў сваю нявесту Ся Шуцзюань (ростам 1 метр 68 сантыметраў) на пачатку гэтага года. Бао стаў весці сусветны пошук нявесты ў 2006 годзе і нават атрымаў два дзесяткі адказаў ад зацікаўленых кабет з розных канцоў краіны і нават з-за мяжы, аднак знайшоў свой лёс недалёка ад дома, паведамляе агенцтва АР.

Перад вяселлем жаніх, апрануўшы спецыяльна пашыты нацыянальны касцюм блакітнага колеру з залатой камізэлькай, адправіўся ў дом сваёй 28-гадовай нявесты на двух вярблюдах, запрэжаных у вазок. Згодна з мангольскай традыцыяй, сваякі нявесты спрабавалі «спыніць» Бао і не даць яму пад'ехаць да дома. Аднак пасля клятвы жаніха сваякі «змякчыліся» і прапанавалі яму чай у знак таго, што ён прыняты ў сям'ю. Бао не ўдалося выканаць традыцыйны паклон перад цесцем і цешчай з-за яго высачэзнага росту і артрыту.

Летась Бао Сішунь трапіў у Кнігу рэкордаў Гінэса, абышоўшы папярэдняга рэкардсмена ўсяго на 2 міліметры. Як паведамляе агенцтва Сіньхуа, да 16 гадоў у Бао быў звычайны рост, аднак пасля гэтага ён стаў рэзка цягнуцца ўверх.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 07130 >

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.07.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 956,78
1 латвійскі лат	4 242,90
1 літоўскі літ	856,25
1 чэшская крона	104,34
1 польскі злоты	789,94
1 расійскі рубель	84,14
1 украінская грыўня	429,04

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	25,4936
10 UAH	50,5815
1000 BYR	11,8609
EUR	35,1072

Курс у гандлёвых кампаніях (на 13.07.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацца на часопіс «Главный бухгалтер. ГЗ» на 2007 год у радзіцай па самай выгаднай цане. Тэлефон радзіцай: 209-69-01.

УП «Минский городской центр недвижимости»

проводит открытый аукцион по предоставлению юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям во временное пользование торговых площадей в торговом центре «Купаловский»

№№ лота	Номера торговых мест	Площадь торгового места кв.м	Начальная цена кв. м, евро	Срок аренды, месяцев	Размер задатка, базовых величин
1.	24	6,5	37,5	12	10
2.	65	6,0	63,0	12	10
3.	83	3,0	63,0	12	10
4.	107	4,0	37,5	12	10
5.	116	4,0	37,5	12	10

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на р/с 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень необходимых документов и порядок подачи определен условиями проведения аукциона. Договор аренды с победителем заключается в течение 3 рабочих дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится 31 июля 2007 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие в аукционе принимаются по 31 июля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Контактные телефоны: 227-40-22, 227-48-36.
Наш сайт в Интернете www.mgcn.by

Пасля пісьма

УНУКІ СКАЗАЛІ, ШТО ДА НАС НЕ ПАЕДУЦЬ, —

пад такім загалоўкам у газеце (№ 108) быў змешчаны ліст жыхароў вёскі Новая Дуброва, што на Акцябршчыне. Вяскоўцы, нагадаем, скардзіліся на тое, што ў іх ніяк не вырашаецца праблема з водазабеспячэннем.

Як паведаміў у адказ на ліст намеснік старшыні райвыканкама сп. Кісялёў (адказ друкуем у перакладзе і пераказе, максімальна блізкім да зместу. — **Рэд.**), водаправод у н.п. Новая Дуброва знаходзіцца на балансе КСУП «Саўгас «Акцябрскі». Ён (трэба разумець, водаправод? — **Рэд.**) не працуе з пачатку 90-х гадоў.

З паніжэннем узроўню грунтовых вод знізіўся дэбіт свідравіны, а таксама знізілася якасць вады ў ёй. У прыватнасці, утрыманне жалеза перавышае дапушчальны ўзровень больш чым у 10 разоў — вада для піцця непрыгодная.

Для ўзнаўлення работы водаправода неабходна абсталяванне новай свідравіны, а таксама рамонт водаправоднай сеткі, што патрабуе значных капітальных укладанняў (каля 200 млн руб.). Такіх сродкаў не мае ні ўласнік водаправода, ні раённы бюджэт.

Пытанне рэканструкцыі водаправода ў н.п. Новая Дуброва будзе разгледжана пры фарміраванні праграмы будаўніцтва на 2008 год.

...Гэта, апошняе, крыху абнадзейвае. Прынамсі, калі не паедуць унукі сёлета, мо, паедуць налета?

Пакуль ёсць, да каго...

Кватэрнае пытанне

КАЛІ ПРАБЛЕМЫ — НЕ ПРАБЛЕМЫ

Я з жонкай, сынам і сям'ёй дачкі (3 чалавекі) жыву ў трохпакаёўцы, якая належыць мне на праве ўласнасці, стаю ў чарзе на пашырэнне. Летась чарга нарэшце падышла, я ўзяў крэдыт, пабудаваў двухпакаёвую кватэру. Але пераязджаць у яе не хачу. На сямейным савеце мы рашылі, што жыць у новабудоўлі будзе сям'я дачкі. Падкажыце, ці абавязкова дарыць дачцэ гэту кватэру? Калі не, як усё аформіць дакументальна?

А.Р., г. Мінск.

Перш за ўсё «дакументальна» трэба аформіць права ўласнасці на новую кватэру.

Потым, калі ёсць такое жаданне, можна падарыць яе дачцэ, і тады яна стане ўласніцай.

Калі жадання дарыць няма, — дачка з сям'ёй з дазволу бацькі могуць прапісацца ў новай кватэры, жыць, аплачваць усе камунальныя і іншыя плацяжы, звязаныя з абслугоўваннем жылога дома. Іншымі словамі, калі кватэра ёсць, астатнія праблемы ўжо не праблемы.

Віктар САВІЦКІ.

БЫВАЙЦЕ, ЛЕАКАДЗІЯ КАНДРАЦЬЕЎНА

Учора раніцай у рэдакцыю прыйшла сумная вестка — не стала Леакадзіі Кандрацьеўны Бараноўскай. 43 гады няспыннага стажу ў нашай газеце. Гэта так трэба было любіць сваю працу, людзей, якія былі побач... А сёння ў апошні раз мы гаворым самыя шчырыя словы ўдзячнасці і развітання ёй. Праца карэктара — адна з самых адказных у рэдакцыі. Гэта пацвердзіць любы газетчык. І мы, звяздоўцы (і маладыя, і вопытныя, сталыя) ніколі не саромеліся падысці да яе, запытацца, як пішацца тое ці іншае складанае слова, назва. І яна, чалавек сапраўды энцыклапедычных ведаў, заўсёды дапамагала.

Сёння нас стала менш. І мы смуткуем. Бывайце, Леакадзія Кандрацьеўна. Усе, хто працаваў з вамі, хто ведаў вас, будуць памятаць вас заўсёды.

Калектыў «Звязды» глыбока смуткуе з выпадку смерці былога супрацоўніка рэдакцыі Мікалая Леанідавіча ВАСІЛЕЎСКАГА і выказвае шчырыя спачуванні яго жонцы, Марыі Андрэеўне Васілеўскай, у мінулым карэктару рэдакцыі, а таксама ўсім родным і блізкім памерлага.

На кантролі ўрада

ТЭЛЕФАНІЯ СУСВЕТНАГА ЎЗРОЎНЮ

Трансляцыя цалкам інтэрактыўных каналаў тэлебачання праз сетку Інтэрнэт, паслуга «відэа па запыту» і ўкараненне іншых найноўшых тэхналогій і магчымасцяў чакае абанентаў РУП «Белтэлекам» у недалёкім будучым. Апошняя навінка, якая ўжо прыйшлася даспадобы наведвальнікам Інтэрнэт- і звычайных кафэ, пастаяльцаў гасцініц і амаратараў клубаў ва ўсім свеце, з'явілася і ў Мінску. З Wi-Fi, а прасцей — бесправодным доступам ў Інтэрнэт ужо азнаёміліся сталічныя аматары высокіх тэхналогій, уладальнікі ноўтбукаў і мабільнікаў апошніх пакаленняў. А ўсё таму, што «Мінская гарадская тэлефонная сетка» актыўна расоўвае новыя паслугі тэлефоннай сувязі. Інавацыйная праграма развіцця галіны сувязі дазваляе значна аднаўляць, мадэрнізаваць існуючыя тэлефонныя станцыі. У прыватнасці, днямі замест старой АТС-234 пачала работу новая АТС-334.

Мадэрнізаваная АТС паляпшае якасць абслугоўвання, павялічвае колькасць і даступнасць паслуг. Абсталяванне, пры дапамозе якога людзі маюць магчымасць карыстацца тэлефонам, выраблена вядомай кампаніяй Alcatel сумесна з беларускім прадпрыемствам. Як дыпламатычна сказаў галоўны інжынер філіяла МГТС РУП «Белтэлекам» Сяргей Папкоў, кошт абсталявання — камерцыйная тайна. Аднак пры гэтым арганізацыя набыла яго за ўласныя сродкі, у рамках праграмы па ўкараненню інавацый. Тэрмін акупляльнасці новых тэхналогій складае дваццаць гадоў, пры тым, што абсталяванне савецкай вытворчасці, якое абслугоўвала станцыю да ліпеня гэтага года, акупілася за 33 гады. Можа, уласныя грошы, якія былі выдаткаваны на мадэрнізацыю, могуць прынесці прыбытак і раней, чым за дваццаць гадоў, аднак гэта адразу ж адаб'ецца на бюджэце спажыўцоў. На сёння ў нашай краіне самы нізкі кошт тарыфаў і паслуг праваднога тэлефона сярод краін СНД, і павышаць яго не збіраюцца. Напрыклад, за ўстаноўку тэлефона трэба заплаціць зараз каля 60 тысяч рублёў. Больш за тое, сярод постсавецкіх краін Беларусь найбольш дынамічна развівае сеткі правадной тэлефаніі. Галоўнай мэтай зніжэння цэн стала барацьба за кліентаў.

— На сёння ў Мінску 77 працэнтаў ёмістасці сеткі складаюць станцыі з новым, сучасным абсталяваннем. Паводле праграмы, да 2010 года ўсе АТС будуць на ўзроўні «сённяшняга дня», мадэрнізацыя тэлефоннага парка завершыцца, — падкрэсліў Сяргей Папкоў, паказваючы работу новай 334-й тэлефоннай станцыі. — Для параўнання, для таго, каб абслугоўваць 10 тысяч абанентаў, абсталяванне былой АТС-234 займала пакой у восемсот квадратных метраў. Зараз для таго, каб наладзіць тэхнічнае абслугоўванне абанентаў і кіраваць усёй работай, трэба толькі задзейнічаць пяцьдзесят квадратных метраў. Мы атрымалі свабодную плошчу, якую будзем здаваць у арэнду, эканомім электраэнергію. Знізіліся выдаткі на ацяпленне.

Працуе станцыя на прынцыпу вялікага камп'ютара. «Мозг» яе складаецца з мікрасхем ці плат. Большыя за рост чалавека металічныя шафы ўтрымліваюць усярэдзіне незлічоную колькасць электронных платаў, кожная з якіх выконвае розную работу.

— Вось, напрыклад, на адной такой мікрасхеме «знаходзіцца» шаснаццаць абаненцкіх камплектаў. Бачыце па сігналу агеньчыкаў (якія размеркаваны тут жа), што людзі размаўляюць па тэлефоне. Вось плата, дзякуючы якой пасля набору нумара адбываецца тэлефонная сувязь, і можна прымаць званок, — паказвае **вядучы інжынер Таццяна ЗАЙЦАВА**. — Для кожнага віду платы дзейнічае асобнае праграмнае забеспячэнне, яны маюць уласную функцыю. Калі, напрыклад, адна з мікрасхемаў «чхнула», захварэла, адбылася авария, то адразу ж сістэма паведамляе аб гэтым, і пасродкам «дыялогу» з падстанцыяй аператар бачыць, што трэба рабіць, ці замяніць схему, ці «падлячыць», а можа, гэта праблема на ліні.

Фота БелТА.

Таццяна ЗАЙЦАВА дэманструе «сэрца» АТС.

На развіццё сувязі ў сталіцы накіроўваецца па 40 мільярдаў рублёў некалькі гадоў запар. Сёлета замена старых АТС працягнецца, у раёне вуліцы Усходняя будзе закрытая АТС-231, У Шабанах — 244-я, а ў раёне вуліцы Мендзялеева не будзе 235-й. Замест іх з'явяцца сучасныя тэлефонныя станцыі.

— Дэкадна-пакрокавыя ўсе ўжо зачынены, застаўся парк каардынатных станцый. Яны будуць заменены на такія, як у еўрапейскіх і іншых развітых замежных краінах, — працягвае Сяргей Папкоў. — Сучасныя тэхналогіі, якія зараз мы актыўна развіваем, дазваляюць аказваць канвергаваныя паслугі, калі адначасова з тэлефаніяй адбываецца і перадача даных. Для спажыўцоў гэта ўжо знаёмая тэхналогія шырокапалоснага доступу ADSL, пры якой адначасова з размовамі па тэлефоне можна выйсці ў хуткасны, да 8 мегабіт зваротнага канала, Інтэрнэт.

На сёння прапануецца каля пятнаццаці відаў паслуг, сярод якіх самыя папулярныя — гэта служба «будзільніка», забарона на выходную сувязь на некаторыя нумары, у асноўным гэта датычацца выпадкаў, калі бацькі не хочуць, каб дзеці ў іх адсутнасць рабілі непажаданыя званкі.

— Сяргей Пятровіч, правадная тэлефонная сувязь вытрымлівае канкурэнцыю з сотавымі аператарамі? Якія прагнозы адносна яе далейшага існавання?

— Час паказаў, што людзі маюць ужо не адзін, а два і нават тры сотавыя тэлефоны, аднак кватэрны ім патрэбен не менш. Ва ўсім свеце баяліся знікнення правадной сувязі, аднак прагнозы не спраўдзіліся. Я думаю, яна не памрэ ніколі. Кватэрам патрэбна ахова, спажыўцы хочуць карыстацца сур'ёзнымі, «магутнымі» сеткамі для перадачы даных, ёсць яшчэ шэраг паслуг, якія сёння не здольныя забяспечыць сотавыя аператары.

— Укараненне новых тэхналогій на тэлефонных станцыях патрабуе перакваліфікацыі персаналу?

— Так, перападрыхтоўка і навучанне нашых супрацоўнікаў праводзіцца на курсах Вышэйшага каледжа сувязі, на занятках, якія наладжваюць пастаўшчыкі абсталявання. Дарэчы, ёсць праблема з занятасцю персаналу, калі для абслугоўвання старой станцыі было неабходна 20—25 чалавек, то зараз патрэбная колькасць работнікаў стала ў некалькі разоў меншая. Трэба вырашаць, што рабіць з астатнімі, каб не адпраўляць іх на вуліцу.

— Колькі абанентаў у сталіцы? Ці ёсць чарга на атрыманне тэлефоннага нумару?

— Каля 750 тысяч, пры ёмістасці сеткі ў 780 тысяч. За апошнія пятнаццаць гадоў сетка выраслa ў два разы. Чаргі не існуе, стараемся працаваць па прынцыпу сёння прыйшоў — атрымаў сёння, у нас дзейнічае сістэма «аднаго акна».

— Калі чакаць прасоўвання новых паслуг кшталту IP TV?

— Wi-Fi ўжо дзейнічае, і мы будзем распаўсюджваць яго вельмі актыўна ў гасцініцах, гатэлях, рэстаранах, месцах, дзе збіраецца шмат людзей. Зараз мы вывучаем рынак, вядзём пошук пастаўшчыкоў якаснага абсталявання, праводзім падрыхтоўчыя работы, ёсць намер з будучага года прапанаваць паслугу «відэа па запыту»: на магутным сэрверы будзе знаходзіцца вялізная база даных фільмаў, і пры выкарыстанні тэлефонных сетак і прылады пад назвай сетбокс можна будзе выбіраць і атрымліваць на свой экран любую стужку. Хуткасць перадачы пры гэтым павінна быць не менш за 20 мегабіт у секунду.

Дарэчы, нават пры з'яўленні самых апошніх распрацовак застануцца і таксафоны. Яны выконваюць сацыяльную функцыю, акрамя таго, у прыватным сектары, спальных раёнах іх наяўнасць неабходна, калі, напрыклад, трэба выклікаць «хуткую дапамогу» ці іншыя службы. Пры тым, карыстацца таксафонамі яшчэ і выгадна.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося **26** дзён

Рэдактар падпольнай «Звязды» Уладзімір Амельянюк — равеснік газеты

15 ліпеня спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння першага рэдактара падпольнай газеты «Звязда», аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля, Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Сцяпанавіча Амельянюка.

Гэта сімвалічна: 90-годдзе «Звязды» — і 90-годдзе Амельянюка...

І яшчэ адну дату — жалобную — мы адзначылі сёлета: 65 гадоў таму, 26 мая 1942 года, Уладзімір Амельянюк загінуў ад варожай кулі пры выкананні задання. Гэта здарылася каля Чырвонага касцёла — прыкладна на тым месцы, дзе пасля вайны на галоўнай плошчы сталіцы — плошчы Незалежнасці — установлены помнік журналістам-падпольшчыкам...

Нагадаем: Уладзімір Амельянюк скончыў педагагічныя курсы, працаваў піянерважатым, настаўнікам, рэдактарам Дзяржынскай раённай газеты. Перад Вялікай Айчыннай вайной быў студэнтам Камуністычнага інстытута журналістыкі ў Мінску. Вайна застала маладога журналіста ў Беластоку, дзе ён праходзіў вытворчую практыку... Шмат дзён і начэй прабіраўся ён да Мінска, дзе жылі бацькі, жонка і сын. Ад варожай бомбы загінула сястра з дзецьмі. Хацелася помсціць, знішчаць акупантаў, вызваляць Радзіму.

Са жніўня 1941 года Ул. Амельянюк — у складзе Камароўскай падпольнай групы. Распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро, пісаў лістоўкі, удзельнічаў у вызваленні ваеннапалонных з лагераў смерці, у стварэнні падпольнай друкарні... У маі 1942-га ў акупаваным Мінску выйшаў першы нумар «Звязды» — газеты-падпольшчыцы, газеты-патрыёткі.

Выхад падпольнай «Звязды» быў падобны на выбух бомбы: у акупацыі, у стане ворага газета заклікала да знішчэння ворага...

Жыццё Уладзіміра Амельянюка, патрыёта-журналіста, яшчэ раз засведчыла, што Слова — таксама Справа.

Таццяна ПАДАЛЯК.

МАРШРУТ ЗАКРЫВАЕЦЦА

У Мінску з 16 ліпеня закрываецца аўтобусны маршрут № 62 «ДС Слабінскага — Архітэктурны інстытут», паведамілі БЕЛТА ў ГУ «Сталічны транспарт і сувязь». Рашэнне прынята на падставе прадпісання УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама ў сувязі з неадпаведнасцю разваротнага кальца канцавога пункта «Архітэктурны інстытут» нарматыўным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да вуліц і аўтамабільных дарог з рэгулярным аўтобусным і тралейбусным рухам.

ЭЛЕКТРАПРЫВАД — НЕ РАСКОША?

У Беларускім пратэзна-артапедычным аднаўленчым цэнтры з'явіцца спецыяльны корпус для сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў. Яго будаўніцтва пачнецца ў IV квартале сёлета і закончыцца ў 2009 годзе. Пры гэтым перш-наперш новы корпус будзе разлічаны на асобаў, якім неабходна набыццё ці аднаўленне працоўных спецыяльнасцяў, як непасрэдна з Мінска, так і з іншых рэгіёнаў Беларусі. У прыватнасці, плануецца, што ў новым корпусе павінен дзейнічаць інтэрнат на 84 месцы.

Больш «на групе» — вышэй попыт

Паводле даных Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у пачатку студзеня ў краіне налічвалася 510 тыс. інвалідаў — адразу на 31 тыс. чалавек больш, чым яшчэ пяць гадоў таму. Пры гэтым рост колькасці людзей «на групе» адзначаны па сутнасці ва ўсіх рэгіёнах. Аднак сумнае «лідарства» тут належыць сталіцы (106 тыс. інвалідаў), Гомельскай (92,4 тыс.) і Мінскай (82,5 тыс.) абласцям.

Як адзначыла начальнік аддзела па справах інвалідаў Рыта Сушко, агульны рост колькасці інвалідаў не мог не адбіцца на паказчыках зваротаў па аказанне пратэзна-артапедычных паслуг. Зараз на пастаянным уліку ў Беларускім пратэзна-артапедычным аднаўленчым цэнтры ўжо знаходзіцца 92 тыс. чалавек. А ў цэлым па той ці іншай патрэбе сюды звяртаецца да 170 тыс. грамадзян. Прычым у цэлым гэтыя патрэбы задавальняюцца. Так, штогод цэнтр прапануе звыш 42 тыс. пар артапедычнага абутку, 38 тыс. розных сродкаў індывідуальнай рэабілітацыі, 21 тыс. сродкаў лячэбнага пратэзавання, больш за 3 тыс. крэсла-калясак, а таксама 7,4 тыс. экзапратэзаў малочнай залозы. Прычым іх значная частка робіцца па індывідуальных заказах. Праўда, якраз тут узнікае адна з папсапраўднаму няпростых праблем — фінансаванне.

Калі з выдзяленнем сродкаў на вытворчасць пратэзна-артапедычных вырабаў з рэгіянальных бюджэтаў вялікіх цяжкасцяў няма, то наконт рэспубліканскага бюджэту ўзніклі пытанні. Да прыкладу, сёлета на крэсла-каляскі для інвалідаў запланавана выдаткаваць 2,6 млрд рублёў. Аднак, згодна з ацэнкамі міністэрства, такая сума зможа «закрыць» усяго 73,5 працэнта ад агульнай колькасці заявак. Адпаведна, калі летась інвалідам удалося выдаць 3117 калясак, то зараз гэты паказчык можа не дасягнуць 3 тысяч. Сапраўды, зараз разглядаецца варыянт павелічэння фінансавання на 400 млн рублёў, што дазволіць дадаткова вырабіць яшчэ прыкладна паўтысячы калясак і, такім чынам, нармалізаваць сітуацыю. Аднак, зазначыла Рыта Сушко, цяперашні малюнак можа паўтарыцца налета. Паводле звестак міністэрства, у 2008 годзе фінансаванне вытворчасці падобных сродкаў перасоўвання можа зноў знізіцца — да 2,2 млрд рублёў. І гэта зноў-такі пры павелічэнні колькасці інвалідаў у цэлым.

Экспарт. І не толькі

Між тым, грошы — гэта пытанне не толькі чэргаў. Менавіта ад сродкаў залежыць і сам асартымент айчынных пратэзна-артапедычных вырабаў, і іх якасць. Апошняя, зазначаюць у міністэрстве, прыкметна палепшылася. А адным з пацвярджэнняў гэтага, нягледзячы на цяжкасці з атрыманнем сертыфікатаў, стаў рост экспарту — у Расію, Літву і Украіну. Дастаткова сказаць, што за мінулыя пяць гадоў агульная сума паставак у гэтыя краіны склала каля 250 тыс. долараў. І прыкладна такі ж «партфель заказаў» Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр мае зараз.

Прычым, мяркуе дырэктар прадпрыемства Іван Волкаў, у будучым беларускія пратэзісты будуць адчуваць сябе на замежных рынках больш упэўнена — падставы для гэтага даюць планы па рэканструкцыі асноўнай вытворчасці цэнтра пад спецыяльнае канструкторска-тэхнічнае бюро. Работы тут павінны пачацца ў 2008 годзе.

Дарэчы, пэўныя напрацоўкі фактычна сталі рэаліяй ужо зараз. Так, на прадпрыемстве ўжо асвоена вытворчасць вусцілак для хворых на цукровы дыябет. А ў бліжэйшых планах — вытворчасць звышлёгкіх (вагой 12—16 кілаграмаў) алюмініевых крэсла-калясак, а таксама рэалізацыя доўгачаканага многімі інвалідамі праекта па вырабу калясак з электрапрывадам. Дарэчы, першая пробная партыя электрапрывадных калясак павінна з'явіцца ўжо сёлета. А, як чаканецца, іх масавая вытворчасць распачнецца ў 2008 годзе.

Апроч таго, паведаміў Іван Волкаў, пратэзна-артапедычны цэнтр мае намер асвоіць ложкі з аўтаматычнай сістэмай рэгуліроўкі іх становішча. Такія ложкі, лічаць у міністэрстве, будуць запатрабаваныя ў дамах-інтэрнатах, а таксама ўсімі ляжачымі хворымі.

Патрэба. Плюс магчымасці

Ці не самай папулярнай тэмай апошняга часу стала ўпарадкаванне сацыяльных ільгот. У тым ліку яно закранула частку інвалідаў. І ў прыватнасці, гаворка ідзе аб забеспячэнні пратэзна-артапедычнымі вырабамі бясплатна ці на льготных умовах інвалідаў III групы, дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў, ветэранаў працы. Прычым не сакрэт: многім з іх абысціся без тэхнічных сродкаў рэабілітацыі сапраўды цяжка.

Але, мяркуюць у міністэрстве, гэтыя праблемы можна вырашыць іншым чынам — зусім не абавязкова ў рамках заканадаўства аб ільготах.

— Зараз ідзе распрацоўка праекта ўказа аб адрасным сацыяльнай падтрымцы, і ў тым ліку дзякуючы ёй з'явіцца магчымасць дапамогі са сродкамі рэабілітацыі інвалідам,— зазначыў міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір Патупчык. — Аднак такая дапамога будзе аказвацца канкрэтна кожнаму чалавеку — у залежнасці ад яго патрэбы і матэрыяльных магчымасцяў. Тады як усе астатнія грамадзяне павінны вырашаць свае праблемы самастойна.

Сяргей ГРЫБ.

Извещение о проведении аукциона 31 июля 2007 года

УП «Минский городской центр недвижимости» проводит 63-й открытый аукцион на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска

№ лота	Тип помещения, адрес, целевое назначение*	Арендуемая площадь, кв. м	Начальная цена, тыс. руб.
КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска» тел. 285-56-02			
1	Цоколь, ул. Ташкентская, 2, ком. 4 «а» (непроизводственное - офис)	6,70	99
2	1 этаж, пр. Партизанский, 32/2 (непроизводственное - офис)	16,10	238
3	1 этаж, ул. Алтайская, 64/1 комната 01 (непроизводственное - офис)	11,30	167
4	1 этаж, ул. Алтайская, 64/1 комната 02 (непроизводственное - офис)	13,90	205
5	1 этаж, ул. Алтайская, 64/1 комната 03 (непроизводственное - офис)	25,70	380
КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска» тел. 223-35-03			
6	Подвал, ул. К. Маркса, 30 (общий вход, под непроизводственное - офис)	75,02	1 109
7	Подвал, ул. Фабричная, 26 (общий вход, под непроизводственное - офис)	23,80	352
8	2 этаж, ул. Физкультурная, 26 «а» (общий вход, под непроизводственное - офис)	46,77	691
9	1 этаж, ул. Красноармейская, 32 (торговый объект продгруппы)	350,87	15 558
10	1 этаж, ул. Прушинских, 34/3 (отд. вход, непроизводственное - офис)	36,40	538
11	Проходной подъезд, ул. Козыревская, 23 (предоставление кредитов населению)	29,96	5 314
КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска» тел. 252-80-63, 200-84-44			
12	1 этаж, пр. Жукова, 25, корп. 1 (магазин промгруппы)	298,30	13 227
КУП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» тел. 213-29-60, 224-53-76			
13	1 этаж, ул. Жуковского, 10/1 (ремонт бытовой техники, телерадиоаппаратуры)	53,42	790
14	Подвал, ул. Асаналиева, 40, корп. 1 (непроизводственное - офис, смешанное, склад)	33,22	491
15	1 этаж, ул. Серова, 17 (бытуслуги)	15,33	227
16	Подвал, ул. Кижеватова, 78 (непроизводственное - офис, смешанное)	13,59	201
17	Подвал, пер. Михайловский, 4 (убежище, памятник архитектуры, целевое использование по согласованию с РОЧС, ЦГиЭ)	122,87	1 816
КУП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска» тел. 294-01-11, 294-16-57			
18	Подвал, ул. Козлова, 8/1 (вход с жильцами, под склад при условии выполнения противопожарных требований)	58,80	869
19	Подвал, ул. Козлова, 50 (услуги населению при условии выполнения противопожарных требований)	65,50	968
20	Помещение, пер. Броневой, 4 (туристические, непроизводственное - офис при условии выполнения противопожарных требований)	15,72	232
21	2 этаж, ул. Щербакова, 32 (туристические, риэлтерские услуги)	38,83	574
22	2 этаж, ул. Щербакова, 32 (ремонт телерадиоаппаратуры)	32,22	476
23	Подвал, ул. Ванеева, 24 (под склад)	33,42	494
КУП «ЖРЭО Советского района г. Минска» тел. 292-74-31, 284-42-26			
24	Помещение, ул. Богдановича, 78 (медицинские услуги, объект спортивного назначения, требуется изменение функционального назначения (перепрофилирование))	91,27	8 094
25	Часть холла и кладовая, ул. Сурганова, 40 (общий вход, непроизводственное - офис)	57,36	848
КУП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» тел. 203-34-66, 203-79-43			
26	Комната, ул. Раковская, 36 (общий вход, непроизводственное - офис)	21,39	316
27	Помещение, ул. Орловская, 17 (в т.ч. подвал 245,42 м.кв., магазин промышленной группы, в помещении находится арестованное оборудование прежнего арендатора)	510,75	22 647
28	Подвал, пр. Независимости, 33 (непроизводственное - офис)	16,00	236
КУП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска» тел. 204-30-46			
29	1 этаж, пр. Пушкина, 28 (под приемный пункт белья в стирку и химчистку)	60,70	897
КУП «Минская спадчина» тел. 227-80-72			
30	2 этаж, ул. Сторожевская, 5 (комната, под непроизводственное - офис)	25,35	2 248
31	4 этаж, ул. Сторожевская, 5 (2 смежные комнаты, под непроизводственное - офис)	35,10	3 113
КУП «Минский городской центр недвижимости» тел. 227-65-71			
32	Блок из 3-х комнат с санузлом, пр. Победителей, 5, км. 306 (непроизводственное - офис)	32,12	2 848
Главное управление потребительского рынка тел. 220-51-34, 219-00-78			
33	Открытый киоск № 214, ТЦ «Столица», пл. Независимости (торговля промышленными товарами)	18,45	1 636
34	Помещение № 331, ТЦ «Столица», пл. Независимости (обменный пункт валюты)	27,00	2 394
35	Помещение № 325, ТЦ «Столица», пл. Независимости (розничная торговля промышленными товарами)	237,00	3 503
36	Помещение № 517, ТЦ «Столица», пл. Независимости (розничная торговля промышленными товарами)	350,70	5 183
37	Помещение № 520, ТЦ «Столица», пл. Независимости (розничная торговля промышленными товарами)	223,05	3 297
38	Помещение, г. Жодино, ул. Труда, 2 (производственное, склад)	783,00	11 573
39	Помещение, г. Жодино, ул. Труда, 2 (производственное, склад)	805,00	11 898
40	Помещение, г. Жодино, ул. Труда, 2 (производственное, склад)	926,30	13 691
41	Помещение, г. Жодино, ул. Труда, 2 (производственное, склад)	10,30	152
КУП «Партизанское» тел. 200-16-91, 200-57-70			
42	Помещение засолочного цеха, ул. Стебенева, 2 (склад)	159,34	2 355
43	Помещение цеха № 1, ул. Стебенева, 2 (склад)	85,20	1 259
44	Помещение фруктохранилища, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	233,01	3 444
45	Помещение овощехранилища, ул. Стебенева, 2 (склад, производственное)	1 053,30	15 568
46	Помещение овощехранилища, ул. Стебенева, 2 (склад, непроизводственное - офис)	19,00	281
47	Помещение овощехранилища, ул. Стебенева, 2 (склад, непроизводственное - офис)	32,34	478
УП «Консервплодовощепереработка» тел. 506-66-05			
48	Часть здания квасильного цеха, п. Самохваловичи (производство мебели)	173,40	2 563

№ лота	Тип помещения, адрес, целевое назначение*	Арендуемая площадь, кв. м	Начальная цена, тыс. руб.
УП «Минскводоканал» тел. 233-74-31			
49	2 этаж здания, п. Ждановичи, насосная станция № 8 (под производство)	220,61	3 261
Управление бытового обслуживания Мингорисполкома тел. 200-99-90			
50	Помещение, ул. Могилевская, 12 (ремонт одежды, бытовой техники, телерадиоаппаратуры, производственное по согласованию)	26,85	397
51	Помещение, ул. Могилевская, 12 (приемный пункт химчистки, стирки, производственное по согласованию)	13,50	200
КУП «БытЭкс» тел. 203-79-66			
52	Помещение, ул. С. Ковалевской, 57 (непроизводственное - офис)	26,00	384
53	5 помещений, ул. С. Ковалевской, 57 (4 помещения без естественного освещения, бытуслуги, производственное)	87,00	1 286
54	Помещение, ул. К. Либкнехта, 102 (производственное, бытовые услуги)	48,90	723
55	Помещение, пер. Северный, 17 (производственное по согласованию)	325,60	4 812
56	Помещение, ул. Кульман, 5 (изготовление ювелирных изделий по заказам)	65,00	961
57	Помещение, ул. Кульман, 5 (5 этаж, производственное - кроме швейного)	349,20	5 161
58	Цоколь, ул. Машиностроителей, 19 (под производственное)	54,80	810
59	Цоколь, ул. Машиностроителей, 19 (под производственное)	142,50	2 106
КУП «Городские бани» тел. 222-73-60			
60	1 этаж, ул. Березогорская,7 , пос. Сокол (производственное - прачечная)	119,85	1 771
61	Подвал, ул. Фабричная, 20 «а» (склад)	130,32	1 926
62	Подвал, ул. Фабричная, 20 «а» (склад, производственное, смешанное)	203,47	3 007
Комитет по здравоохранению УП «Жилздрав» тел. 247-76-92			
63	1 этаж, 2 комнаты, ул. Якубовского, 41 (непроизводственное - офис)	35,50	525
КУП «Минсктранс» Филиал «Троллейбусный парк № 4» тел. 220-52-72			
64	Подвал, ул. Одоевского, 113	22,80	337
КУП «Минсктранс» Филиал «Автобусный парк № 1» тел. 223-26-01			
65	2 этаж, ул. Прушинских, 23 (непроизводственное - офис, требуется ремонт)	36,75	543
66	2 этаж, ул. Прушинских, 23 (непроизводственное - офис, требуется ремонт)	16,50	244
67	2 этаж, ул. Прушинских, 23 (непроизводственное - офис, требуется ремонт)	12,30	182
68	2 этаж, ул. Прушинских, 23 (непроизводственное - офис, требуется ремонт)	12,30	182
69	2 этаж, ул. Прушинских, 23 (непроизводственное - офис, требуется ремонт)	25,50	377
КУП «Минсктранс» Филиал «Автобусный парк № 2» тел. 223-26-36			
70	Часть открытой асфальтированной стоянки, ул. Тростенецкая, 12 (под выставку-продажу автомобилей)	1 412,50	20 877
КУП «Минсктранс» Филиал «Минский автовокзал» тел. 219-36-59			
71	1 этаж, часть помещения, ул. Ванеева, 34 (под автомат по продаже напитков)	2,00	355
72	2 этаж, зал ожидания, ул. Филимонова, 63 (под игровой автомат «кран-машина»)	2,00	355
КУП «Минсктранс» Филиал «Служба энергохозяйства» тел. 288-22-65			
73	Часть помещения, ул. Гурского, 17 (под автомат по продаже напитков)	1,50	266
УП «Фауна города» тел. 251-96-79			
74	3 помещения, ул. Гурского, 42 (3 комнаты), под содержание животных	79,65	1 177
ОАО «Минскдрев» тел. 248-57-52			
75	Комната № 116, пр. Рокоссовского, 4, корпус 2 (непроизводственое - офис)	19,65	290
КУП «Минская овощная фабрика» тел. 244-36-82			
76	Мастерская с арочником, п/о Тростенец, Минский район (требуется ремонт)	401,70	5 937
77	Ангар арочного типа, п/о Тростенец, Минский район (склад, требуется ремонт)	265,20	3 920
78	Кирпичное здание, д. Б. Стиклево, Минский район (склад, без коммуникаций, требуется ремонт)	144,00	2 128
УП «Киновидеопрокат» тел. 227-54-71			
79	Помещение, ул. Казинца, 117 (кинотеатр «Электрон», отдельный вход, под непроизводственное - офис)	212,27	3 137
УП «Морена» тел. 227-43-33, 227-33-46			
80	Помещение, ул. Левкова, 37 (производственное, отсутствуют коммуникации, требуется ремонт, необходимо согласование режима работы)	211,80	3 130
КУП «Городские парки Минскзеленстроя» тел. 280-26-92			
81	Площадка, пр. Независимости, 84, ПКиО им. Челюскинцев (реализация горячей выпечки из слоеного теста, напитков на базе прицепа «Купава»)	4,00	709
82	Площадка, пр. Независимости, 84, ПКиО им. Челюскинцев (реализация горячей выпечки из слоеного теста, напитков на базе прицепа «Купава»)	4,00	709
83	Площадка, ул. Фрунзе, 2, ПКиО им. М. Горького (реализация горячей выпечки из слоеного теста, напитков на базе прицепа «Купава»)	4,00	709
84	Площадка, ул. Фрунзе, 2, ПКиО им. М. Горького (реализация горячей выпечки из слоеного теста, напитков на базе приц

Курс — на прэстыж краіны

Напярэдадні прафесійнага свята Дня металурга, які прыходзіцца на заўтрашні дзень, у Нацыянальным прэс-цэнтры прайшла сустрэча кіруючых работнікаў флагмана айчыннай металургіі — вытворчага аб'яднання «Беларускі металургічны завод» у асобе яго кіраўніка Мікалая Андрыянава, які да таго ж з'яўляецца генеральным дырэктарам аднайменнага прадпрыемства РУП БМЗ, што ў Жлобіне, а таксама першых асобаў заводаў-сумежнікаў — Леаніда Маркава («Магілёўскі металургічны завод») і Адама Вашкова (РУП «Рэчыцкі метызны завод»).

Па прадукцыі, якая выпускаецца беларускімі металургамі, нашу краіну ведаюць нават у самых аддаленых пунктах планеты. Адпаведна, абсалютная большасць металічных вырабаў з'яўляюцца экспартнай пазіцыяй рэспублікі. Безумоўна, што асабняком у спісе металургічных прадпрыемстваў стаіць РУП «Беларускі металургічны завод». Прадукцыя ў выглядзе металакорда выкарыстоўваецца ў гумавых шынах на балідах «Формулы-1». А ўчора на РУП БМЗ быў запушчаны сучасны комплекс па выпуску гарачакатаных бясшоўных труб, якія ўжо раскуплены заказчыкамі да канца года.

У заключэнні прэс-канферэнцыі ўвесь дырэктарскі корпус вытворчага аб'яднання «Беларускі металургічны завод» падкінуў журналістам ідэю павіншаваць у сваіх сродках масавай інфармацыі металургаў, лідэшчыкаў і ўсіх людзей, якія звязаны з гэтай галіной, з прафесійным святам. «Звязда» далучаецца да гэтых пажаданняў.

Кар.»Звязды».

«ЛЕПШЫ ПРАДПРЫМАЛЬНІК 2006 ГОДА»

Падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу

Аднак менавіта ў сферы турызму, аказання фізкультурна-аздараўленчых паслуг, грамадскага харчавання і па лініі фермерства не былі вызначаны пераможцы, бо, на думку намесніка міністра эканомікі Андрэя Тура, у гэтых накірунках індывідуальныя прадпрымальнікі яшчэ не дасягнулі неабходнага ўзроўню, калі можна было б выяўляць лепшых з лепшых.

На 10-м, юбілейным, конкурсе быў істотна ўзняты яго статус, калі вынікі спаборніцтва прадпрымальнікаў вызначала кіраўніцтва краіны. Увогуле ў мерапрыемстве прынялі ўдзел 889 суб'ектаў гаспадарання, а на другім этапе конкурсу было 217 прадпрымальніцкіх структур.

Так, у намінацыі «Лепшы прадпрымальнік у галіне вытворчасці спажывецкіх тавараў» пераможцам стала сумеснае прадпрыемства **закрытае акцыянернае таварыства «МІЛАВІЦА»**; у галіне вытворчасці прадуктаў харчавання — **вытворчы кааператыў «МОТАЛЬ»** (Брэсцкая вобласць, Іванаўскі раён, в. Моталь); у галіне вытворчасці тавараў прамысловага прызначэння — **навукова-вытворчае таварыства з абмежаванай адказнасцю «БЕРЛІО»** (г. Мінск); у галіне будаўнічай дзейнасці — **сумеснае закрытае акцыянернае таварыства «МАНТАЖХІМАБАРОНА»** (г. Гродна); у галіне аптовага і рознічнага гандлю — **замежнае вытворча-гандлёвае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «МІРАЛЕКС»** (г. Мінск), у галіне медыцынскай дзейнасці — **беларуска-германскае сумеснае прадпрыемства «ФРЭЗЕНІУС-БАРЫСАЎ-ДЫЯЛІЗАТЭХНІК»** у форме таварыства з абмежаванай адказнасцю (г. Барысаў); па лініі арганізацый з замежнымі інвестыцыямі — **сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ТОП КАМФОРТ»** (Гродзенская вобласць, в. Новая Гожа); у галіне аказання паслуг — **індывідуальны прадпрымальнік Канстанцін Эдуардавіч ЭДЭЛЬМАН** (г. Магілёў); у намінацыі «Лепшы суб'ект інфраструктуры падтрымкі і развіцця прадпрымальніцтва» — **камунальнае інфармацыйна-кансультацыйнае ўнітарнае прадпрыемства «НАВАПОЛАЦКІ ЦЭНТР ПРЫДПРЫМАЛЬНІЦТВА І НЕРУХОМАСЦІ»** (г. Наваполацк); у намінацыі «Лепшы прадпрымальнік-экспарцёр» — **замежнае прыватнае ўнітарнае вытворча-гандлёвае прадпрыемства «ЧЕСС-БЕЛ»** (г. Віцебск); у якасці арганізатара новых рабочых месцаў — **закрытае акцыянернае таварыства «Навукова-вытворчая арганізацыя «ЭЛЬВІРА»** (г. Мінск); сярод банкаў па аказанню паслуг прадпрымальнікам — **сумеснае беларуска-расійскае адкрытае акцыянернае таварыства «БЕЛГАЗПРАМБАНК»** (г. Мінск).

Андрэй Тур паведаміў, што сёлета арганізацыйны камітэт конкурсу выключыў са спісу прэтэндэнтаў арганізацыі, якія займаліся тынтунёвай вытворчасцю.

Дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтву Міністэрства эканомікі Беларусі Аляксандр Ліхачэўскі адзначыў, што сёлета ў краіне дзейнічае каля 30 тысяч суб'ектаў малога прадпрымальніцтва і 192 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў, на якія прыпадае каля 8,8 працэнта ўнутранага валавога прадукту Беларусі і 24 працэнты ад агульнага аб'ёму знешнегандлёвых аперацый.

Сяргей КУРКАЧ.

Цяпер спявае... міліцыя

На плошчы Свабоды — галоўнай плошчы фестывальнага Віцебска — падчас «Славянскага базару» міліцыя не толькі ахоўвала парадак, але і... спявала.

Вакальна-інструментальны ансамбль УУС Віцебскага аблвыканкама паказаў шматлікім прахожым даволі добры клас творчасці. Цікава, што музыканты і спевакі ў парадной міліцэйскай форме не толькі выканалі творы з традыцыйнага «міліцэйскага рэпертуару», але і шырока вядомыя песні: «Генералы пясчаных кар'ераў», «У краю магнолій», «Мы жадаем шчасця вам» і іншыя. Іх нават выклікалі на біс! Адным з першых гледачоў стаў міністр унутраных спраў Беларусі, генерал-лейтэнант міліцыі Уладзімір Навумаў.

На плошчы таксама працаваў імправізаваны кансультацыйны цэнтр УУС, дзе на пытанні грамадзян адказвалі прадстаўнікі ўпраўленняў: па грамадзянству і міграцыі, ДАІ і кадраў. Побач з гэтай палаткай ДАІ праводзіла конкурс паміж дзецьмі на лепшае ваджэнне веласіпеда і веданне правілаў дарожнага руху. Пераможцы атрымлівалі флікеры, іншыя сувеніры. Праводзіліся экзамены сярод жадаючых здаць на правы матацыкліста.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

САКРЭТЫ ПРЫГАЖОСЦІ

Зёлкі на службе касметолагаў

Са старажытных часоў выкарыстоўваліся лекавыя ўласцівасці настояў і адвараў, атрыманых з лісця, пладоў, насення, каранёў розных раслін. Многія з іх і сёння незаменныя ў касметалогіі, бо змяшчаюць унікальныя біялагічна актыўныя рэчывы, здольныя сілкаваць, амалоджваць і абараняць скуру ад уздзеяння фактараў знешняга асяроддзя.

Экстракт **шалфею** цудоўна дэзінфіцыруе і заспакойвае запалёную скуру, садзейнічае аднаўленню клетак, таму шырока выкарыстоўваецца ў касметалагічных працэдурах і сродках, якія дапамагаюць змагацца з першымі прыметамі старэння скуры, а таксама ў крэмах і сываратках для догляду сталай скуры. Таксама шалфей нармалізуе работу тлушчавых залоз і лечыць вугравы сып. Мускатны шалфей стымулюе рост валасоў, папярэджвае іх выпадзенне і з'яўленне перхаці, таму з'яўляецца частым кампанентам шампуняў і бальзамаў для валасоў.



Экстракт **ліпавага цвету** валодае актыўным заспакаяльным і раназагойным дзеяннем. Ён умацоўвае капіляры і паскарае працэс рэгенерацыі клетак, дзякуючы чаму паляпшаецца колер твару, павышаецца эластычнасць і пругкасць скуры. Ліпа асабліва карысная пры сухой скуры, а ўлетку ўмывацца залацістым і духмяным адварам ліпы не толькі прыемна, але і карысна: ён выдатна змякчае і ўвільгатняе скуру.

Экстракт **святаянніку** змяшчае эфірныя маслы, 10 дубільных рэчываў, вітамін С, каратын. Святаяннік аднаўляе клеткі, амалоджвае і заспакойвае скуру.

Вельмі карысная для скуры і **пятрушка**, бо багатая на вітамін А, які называюць «вітамінам прыгажосці». Пятрушка аказвае танізуючае дзеянне, павышае пругкасць і эластычнасць скуры.

Калі ў вас тлустая і порыстая скура, выкарыстоўвайце крэмы і бальзамы з **календулай**. Яна звужае поры, сілкуе і заспакойвае скуру, устараняе лішак скурнага тлушчу. За кошт біялагічна актыўных рэчываў і вітамінаў, якія змяшчаюцца ў календуле, актывізуецца абмен рэчываў у скурных покрывах.

Маслы, якія змяшчаюцца ў **мяце** (у першую чаргу ментол), уваходзяць амаль ва ўсе сродкі па догляду ног.

Эфірнае масла **мелісы** прымяняецца для лячэння герпесу, фурункулаў, вугравога сыпу і скурных раздражненняў. Гэта масла часта ўключаюць у састаў сродкаў па догляду тлустых валасоў і ўстараненню перхаці.

РЭЦЭПТЫ АДВАРАЎ І МАСАК

- 4 ст. лыжкі аўсянкі заліце 60 мл кіпеню, размяшайце да атрымання густой масы і дадайце 2 ч. лыжкі дробна парэзанага лісця мяты. Такая маска асвяжае скуру, здымае пачырваненне.
- Сок пятрушкі — просты і танны спосаб адбяліць скуру, выдаліць пігментныя плямы і вяснушкі: заліце кіпенем дробна парэзаную зеляніну пятрушкі, настойвайце 20—30 хвілін, працадзіце, астудзіце і працірайце твар 2—3 разы на дзень.
- Пры тлустай, праблемнай і занадта патлівай скуры можаце выкарыстаць такі настой для ўмывання: 1 ст. лыжку сухога святаянніку заліце шклянкай кіпеню. Пасля ўмывання настоем змажце твар пажыўным крэмам.

-2429-

ХАТНІЯ НАРЫХТОЎКІ

Чырвоныя парэчкі — увесь год

Сок усяго толькі са 150 г ягад чырвоных парэчак забяспечвае сутачную патрэбнасць арганізма ў вітаміне С. Акрамя таго, іх ягады змяшчаюць вітаміны Р і B_1, умацоўваюць крывяносныя сасуды, таму вельмі карысна ўжываць стравы з чырвоных парэчак на працягу ўсяго года.



ЖЭЛЕ

Разамніце 1 кг падрыхтаваных ягад, уліце 1 шк. вады, пагатуйце на невялікім агні, працадзіце праз марлю, добра адцісніце сок. Усыпце 1,25 кг цукру і варыце на моцным агні 30 хвілін (з моманту закіпання), пасля чаго праверце: выліце лыжку соку на талерку, і калі ён праз 10 хвілін загусцее, — жэле гатовае, калі ж сок застанецца вадкім, то гатаванне трэба працягваць. Гатовае жэле разліце ў слоікі і закатайце.

ВАРЭННЕ

Падрыхтаваныя ягады чырвоных парэчак заліце гарачым сіропам і вытрымайце 10 гадзін. Давядзіце да кіпення, паварыце на невялікім агні 5 хвілін, астудзіце да 20—25 °С. Другі раз варыце 8—10 хвілін, зноў астудзіце 10—15 хвілін і гатуйце ўжо да гатоўнасці.

На 10 кг ягад 1,5—1,75 кг цукру, 2—2,5 шк. вады.

СОК

Ягады разамніце ў каструлі драўляным таўкачыкам, мязгу адцісніце пад прэсам. Сок адфільтруйце праз марлю і грэйце пры тэмпературы 100 °С 1—3 хвіліны. На 100 г соку дадайце 100 г цукру. Гарачы сок адразу разліце ў слоікі і закатайце.

ТАНІЗУЮЧАЯ ГАРБАТА

...з малінамі і лісцем лімонніку. Вазьміце па 1 частцы размолатых ягад малін, чырвоных парэчак і лісця лімонніку. На аб'ём атрыманай сумесі дадайце столькі ж цукру (можна менш). Дзве сталовыя лыжкі заварыце шклянкай кіпеню.

...з малінамі і лісцем вінаграду. Ягады малін і чырвоных парэчак пасушыце ў духоўцы, размаліце, вазьміце па 1 частцы. Лісце вінаграду высушыце на паветры, здрабніце і таксама вазьміце 1 частку. Усё перамяшайце і на атрыманую колькасць парашку дадайце столькі ж цукру. Заварыце 1 ст. лыжку сумесі шклянкай кіпеню.

РАІМ ПРЫГАТАВАЦЬ

Пірог з чарніцамі

250 г мукі, 150 г цукру, 3 пакецікі ванільнага цукру, 125 г сметанковага масла, 250 г густой смятаны, 500 г чарніц, 6 яек, 100 г тварагу, 2 ст. лыжкі паніровачных сухароў, цукровая пудра, соль.

З мукі, 75 г цукру, 1 пакеціка ванільнага цукру, 1 яйка, масла і солі хутка замясіце цеста. Астудзіце яго, пасля чаго раскачайце ў круглы пласт і засцяліце раз'ёмную форму дыяметрам 28 см.

Смятану, тварог, цукар, ванільны цукар, яйкі змяшайце да атрымання крэмападобнай масы. Цеста пасыпце сухарамі, зверху пакладзіце чарніцы (2 ст. лыжкі пакіньце для ўпрыгажэння), заліце ягады смятанным крэмам і выпякайце 45 хвілін пры 180 °С. Гатовы пірог пасыпце ягадамі з цукровай пудрай.

-2430-

ХОД КАНЁМ

Беларусі даверылі правядзенне кваліфікацыйнага этапу Кубка свету.

У гэтыя выхадныя ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і каняводства ўпершыню за ўсю гісторыю пройдзе кваліфікацыйны этап Кубка свету па трохбор'ю (у суботу спаборніцтвы пачнуцца а 10-й гадзіне, у нядзелю — а 11-й). Права на яго правядзенне маюць толькі 11 краін. Прызавы фонд спаборніцтваў у Ратамцы складае 25 тысяч еўра. Аднак, акрамя грашовых узнагарод, спартсменаў заахвочвае магчымасць заваяваць рэйтынгавыя балы для ўдзелу ў фінале Кубка свету, які адбудзецца вясной 2008 года .

Зараз усе коннікі толькі і думаюць, як палепшыць свой рэйтынг і атрымаць ліцэнзіі на летнія Алімпійскія гульні ў Пекіне. Галоўныя надзеі нашай краіны звязаны з Вячаславам Пойта і Аленай Целяпушкінай. Яны, як і Ірына Ліс (выступае ў выездцы), з'яўляюцца лідарамі беларускай каманды, паведаміла першы намеснік старшыні Беларускай федэрацыі коннага спорту Наталля Юранава. Наталля Альгертаўна таксама заўважыла, што наогул турніры па трохбор'ю ў Беларусі адбываюцца ўжо 10 гадоў.

Сёлета Беларусь прыме пяць міжнародных стартаў. Гаспадыняй наступнага ў канцы жніўня стане база ў Палачанах Маладзечанскага раёна, потым спаборніцтвы прымуць Ратамка і Гомель.

Ірына ПРЫМАК.

КОЛЬКІ ЧАЛАВЕК ЖЫВЕ Ў СТАЛІЦЫ,

падлічылі ў Мінскім гарадскім упраўленні статыстыкі. На 1 чэрвеня 2007 года ў горадзе было прапісана 1 800 500 чалавек. З пачатку года ў Мінск прыбыло 10 700 чалавек.

Сярод новаспечаных мінчан жыхары Беларусі складаюць 90,6 працэнта, расіяне — 4,4 працэнта, украінцы — 0,8 працэнта. За паўгода са сталіцы выехалі 7,9 тысячы чалавек.

Вольга ШАЎЧУК,
«Мінск-Навіны».

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.55	21.35	16.40
Віцебск —	4.37	21.32	16.55
Магілёў —	4.45	21.25	16.40
Гомель —	4.50	21.13	16.23
Гродна —	5.12	21.49	16.37
Брэст —	5.21	21.41	16.20

Імяніны

ПР. *Ангеліны, Дзям'яна, Кузьмы, Нікадзіма, Пятра;*
К. *Ангеліны, Ізабелы, Каміля, Марцэля, Якуба.*

Месяц

Маладзік у 15.05
Месяц у сузор'і Рака

Па звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 15.07.2007

Для бязвоблачнага неба: UV INDEX 6 5

З улікам прагназуемай воблачнасці: UV INDEX 6 5

- Экстрэмальны ..... 11+
- Вельмі высокі ..... 8—10
- Высокі ..... 6—7
- Умераны ..... 3—5
- Нізкі ..... 1—2

З **11** да **15** гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **15 хвілін**.

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+29 — +31 °С	МАСКВА	+21 — +23 °С
ВІЛЬНЮС	+24 — +26 °С	РЫГА	+19 — +21 °С
КІЕЎ	+30 — +35 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	+15 — +17 °С

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

ЛЬВЫ ЗМОГУЦЬ БЛІСНУЦЬ РОЗУМАМ, А СТРАЛЬЦЫ — ДАБІЦЦА ПОСПЕХУ Ў ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

АВЕН. Панядзелак прынясе рамантычны настрой. Варта засцерагацца таго, што, задумаўшыся, вы акуняцеся ў вір ілюзій і можаце выдаць жаданае за сапраўднае. У аўторак, насупраць, рэальны свет апынецца каля вашых ног — варта толькі як след захацець і крыху для гэтага папрацаваць. У сераду не варта выпрабоўваць цярпенне навакольных, якімі б добразычлівымі яны ні выглядалі. Нават самы нявінны жарт над блізкім можа выклікаць непрыемныя наступствы. Другая палова тыдня падыдзе для зменаў у знешнім абліччы і, калі такое магчыма, — у манеры паводзінаў. У чацвер можаце атрымаць заслужаную пахвалу і падтрымку начальства.

ЦЯЛЕЦ. Тыдзень можа прынесці поспех у прафесійнай галіне. Давядзецца прымаць сур'ёзныя рашэнні. Каб яны былі правільнымі, выслухайце парады навакольных, але пакіньце за сабой апошняе слова. Вам неабходна аб'ектыўна ацаніць асабістыя здольнасці і магчымасці. Важна таксама ўлічваць стомленасць, якая назапасілася. У панядзелак пажадана нічога новага не прадпрымаць. Правярайце ў пятніцу ўсю інфармацыю, бо магчымыя недакладнасці і скажэнні. Пастарайцеся падтрымаць сяброў у цяжкую хвіліну. Пажадана правесці выхадныя з дзецьмі.

БЛІЗНЯТЫ. Увесь тыдзень вас будуць крытыкаваць з усіх бакоў — і амаль увесь час па справе, вось што крыўдна! У аўторак давядзецца вырашаць задачу з двума невядомымі: ад правільнага адказу будзе залежаць, ці адкрыюцца перад вамі новыя магчымасці. У чацвер не спяшайцеся браць на сябе кіраўніцтва ці займаць лідзіруючую пазіцыю — зайздросныя і інтрыганы толькі і чакаюць, што вы ступіцеся. У нядзелю ўсё, што плануеце, будзе ажыццяўляцца... з дакладнасцю да наадварот.

РАК. Панядзелак і аўторак, хутчэй за ўсё, не выклічуць асаблівага захаплення, бо вашы планы могуць змяніцца да непазнавальнасці. Пастарайцеся быць больш уважлівымі ў справах, звязаных з грашамі. Непажадана раскрывацца сябрам пра свае фінансавыя праблемы — гэта дапаможа пазбегнуць непрыемнасцяў. У панядзелак можаце дасягнуць поспеху, звязаных з работай на камп'ютары ці з іншымі тэхнічнымі навыкамі. Беражыцеся падману і спакушэння. У суботу пастарайцеся пазбавіць ваш дом ад лішняга хламу. У нядзелю дзень чакаецца клапотны — магчыма, вам давядзецца пабываць у самых розных месцах.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні будзеце вельмі вызначацца моцным духам, бліскучым розумам і рашучасцю ў справах. Што б ні здарылася — вы будзеце змагацца да пераможнага канца. Цалкам рэальна павышэнне па службе, асабліва калі яно чакалася ўжо даволі даўно. Пажадана стрымліваць парывы пачуццяў, якія вас перапаўняюць, бо гэта можа не спадабацца вашым калегам. Пастарайцеся не стварацца нагоды для плётак — праявіце дысцыплінаванасць і сабранасць. У суботу адчуеце прыліў сіл. Магчыма, гэту акалічнасць варта выкарыстаць на карысць рабоце.

ДЗЕВА. Пастарайцеся не адмаўляць у дапамозе людзям, якія да вас звяртаюцца. Памятайце, што вы здольныя прыцягнуць увагу навакольных, спалучаючы аптымізм і гібкасць у паводзінах. Здзяйсняючы чарговы подзвіг, не забудзьцеся хоць зрэдку цікавіцца навакольным светам. У зносінах з дзелавымі партнёрамі вам спатрэбяцца такія якасці, як цярпенне, уступлівасць і ўменне рэальна ацэньваць сітуацыю. У панядзелак звярніце пільную ўвагу на інфармацыю, якую атрымліваеце. У сераду, пры неабходнасці, можаце разлічваць на сяброўскую дапамогу. Субота прыдатная для паездак, падарожжаў, камандзіровак. У нядзелю лепш не прадпрымаць нічога новага.

ШАЛІ. Пастарайцеся страсянуцца — неабходна тэрмінова пазбавіцца ад стану апатыі, а адпачываць вам на гэтым тыдні ніхто не дасць. Не губляйце каштоўны час. У пачатку тыдня не спакушайцеся фальшывымі абяцаннямі — так нядобразычліўцы могуць паспрабаваць уставіць вам палкі ў колы. Праявіце неабходную пільнасць. У сераду не варта сумнявацца ў асабістых сілах: надумлівасць і так не раз падводзіла вас, не давайце ёй ні шанца. У чацвер ваша ўзнагароджанне будзе цалкам залежаць ад інтэнсіўнасці работы. Больш уважліва аднясіцеся да блізкіх людзей — ім патрэбен ваш клопат.

СКАРПІЁН. Не рэкамендуецца змяняць звыклую галіну дзейнасці. Для тых, каму хочацца разнастайнасці, зоркі абяцаюць перамену месцаў: перамовы аб пераездзе ў новае памяшканне ці адкрыццё філіялу ў іншым горадзе ці краіне. Калі хочаце прасунуцца па службовай лесвіцы, старайцеся выказваць свае думкі коратка. Знаёмыя могуць падзяліцца з вамі тайнамі свайго асабістага жыцця, але лепш нікому больш пра гэта не гаварыць — плёткі могуць нашкодзіць вам. У панядзелак лепш распраўвіцца з дакументацыяй, якая назапасілася. Серада — цудоўны дзень для прымірэння і аднаўлення згубленых адносінаў.

СТРАЛЕЦ. Пажадана падумаць над зменай іміджу. Не варта на гэтым тыдні высвятляць адносіны з начальствам: не толькі не канфліктуйце з ім, але і па магчымасці радзей трапляйцеся яму на вочы. Сачыце за сваёй мовай, пастарайцеся абдумваць тое, аб чым гаворыце. Абставіны будуць спрыяць перагляду прынцыпаў і стэрэатыпаў паводзінаў. Поспех будзе спадарожнічаць вам у грамадскай дзейнасці і дабрачыннасці. Больш часу аддавайце любімай рабоце: пакіньце руціну і займіцеся раскрыццём свайго творчага патэнцыялу. Верагодна абвастрэнне адносінаў з дзецьмі.

КАЗЯРОГ. Тыдзень складаны, таму запасіцеся цярпеннем і вытрымкай. У панядзелак будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі. У аўторак могуць падпільноўваць падман і прамашкі — не цешце сябе поспехамі ў фінансавых справах і ў бізнэсе. Будзьце больш асцярожнымі з інфармацыяй, асабліва калі яна датычыцца вас. У чацвер лепш не пачынаць нічога новага — займіце пазіцыю чакання і паступайце абдумана і мудра. У суботу давядзецца адстойваць свае погляды і інтарэсы.

ВАДАЛЕЙ. Смела будуйце з аднадумцамі планы па стварэнню сумесных прадпрыемстваў — ім забяспечана цудоўная будучыня. Абапірайцеся на даўнія сувязі і правераных часам сяброў — менавіта яны стануць вам добрай апорай на доўгі час. У панядзелак магчымыя дзелавыя паездкі і важныя публічныя выступленні. У сераду пачакайце з важнымі справамі і дзеяннямі — лепш прысвяціць гэты дзень выпраўленню памылак і недапрацовак. А вось у пятніцу ні ў якім разе не кідайце сваіх пачынанняў.

РЫБЫ. Тыдзень будзе насычаны рознабаковымі падзеямі і прыемнымі сустрэчамі. Можа пашанцаваць у многім — усё залежыць ад таго, да чаго вы імкняцеся ў дадзены момант. Пастарайцеся раскрыць свой творчы патэнцыял. У чацвер можаце разлічваць на дапамогу сяброў. Калі ўзнікне пачуццё ўнутранага пратэсту ў дачыненні да перамены месцаў, пажадана адмовіцца ад далёкіх камандзіровак. Пастарайцеся не раздражняцца па дробязях, а ўпарта імкніцеся да вызначанай мэты. Тады вы адчуеце, што настрой цудоўны, плечы распраўляюцца самі па сабе і праясняюцца далягляды. Выхадныя лепш правесці на прыродзе.

Дзве даты

14 ліпеня

1712 год — закончана будаўніцтва Навагрудскага фарнага касцёла — помніка архітэктуры сталага барока. Ён узведзены на месцы першага гатычнага касцёла, заснаванага ў 1395 годзе пры князі Вітаўце.

1789 год — пагроза разгону Устаноўчага сходу выклікала паўстанне ў Парыжы. 14 ліпеня 1789 года была штурмам захоплена крэпасць-турма Бастылія, сімвал абсалютызму. Гэты дзень лічыцца датай пачатку Вялікай французскай рэвалюцыі.

Цытата дня

«Лепш змагацца сярод нямногіх добрых людзей супраць мноства дурных, чым сярод мноства дурных супраць нямногіх харошых».

Антысфен з Афін (450—360 г да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф.

Усміхнёмся!

Тры падлеткі размаўляюць аб тым, калі пачынаецца жыццё.

— Жыццё пачынаецца ў момант зачацця.

— Не, у момант нараджэння.

— Нічога вы, хлопцы, не разумееце. Жыццё пачынаецца, калі бацькі ад'язджаюць на дачу...

☺

Два прыяцелі.

— Ведаеш, з-за жонкі я кінуў піць, курыць, гуляць у карты...

— Віншую, спадзяюся зараз яна шчаслівая?

— Ды дзе там! Усякі раз, калі яна адкрывае рот, яна разумее, што ёй няма чаго сказаць!

☺

Двое ў аўтамабілі ў лесе. Яна:

— Ну чаму стаім? Паехалі з гэтага лесу!

Ён:

— Леначка, ну ведаеш, у карбюратары кандэнсат...

Яна:

— Ды ў цябе «Пежо» на інжэктарах, а мой натуральны колер валасоў каштанавы, а не белы! Паехалі, кажу!

ШАШКІ

БЛІЦ-29

У якасці яго заданняў падаём новыя кампазіцыі гросмайстра СССР Леаніда Вітошкіна (Гомель):



№ 1. БЕЛЫЯ: b2, b4, b6, c1, c5, d2, d6, f6 (8). ЧОРНЫЯ: a3, e3, f2, f4, f8, g5, h4 (7). Выйгрыш.

№ 2. БЕЛЫЯ: e5, f4, дамкі e3, f2, h4, h6 (6). ЧОРНЫЯ: a5, b4 (2). Пазбаўленне хадоў простай чорных: 1. ed4!! bc3A 2. d:b2! 3. ba3 4. ab4 5. ef6 6. fc5 7. fe7 8. hg7 9. hg5#. Варыянт А1. ... ba3 пашукайце самастойна.

№ 3. БЕЛЫЯ: дамкі 6, 11 (2). ЧОРНЫЯ: 8, 36, 38 (3). Перамога белых.

Лепшага рашальніка чакае сюрпрыз аўтара — «Шашечный вестник» № 4 (Дрогичин, 2004).

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рубрыка «Шашкі».

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

Конкурс прысвячаецца 90-годдзю газеты «Звязда».

РАШАЕМ, АНАЛІЗУЕМ

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-3: № 8 (М. Грушэўскі). b8 (h2) f2 (b2A) e3 (c1B) a7, d4=. B(h4-g3) d4 (a1) be5 (f2) h8=. A(d2) a7 (g1) g3, d4=.

Рашылі: В. Краўчук і С. Нячаеў (Баранавічы), І. Астроўскі і С. Гурыновіч (Мінск), Аляксандра Камінская (Вілейка), А. Булаўка (Новалукомль), У. Бандарык, Ю. і А. Мікулічы (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), І. Мацкевіч (Жодзіна), В. Гаўрыш (в. Навасёлкі-1 Пастаўскага раёна), А. і І. Ашыхміны і У. Ціханаў (п/а Рудаўка Нясвіжскага раёна), А. Янчук (Камянец), А. Пярхальскі (Глыбокае), В. Голас (Любань), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), У. Аўласенка (Гродна), В. Белы (Калінкавічы) і інш.

А вось А. Белы, В.і Р. Мурашкі, М. Падбярэзскі і П. Шклудаў (Наваполацк), Р. Сідарчук (Брэст), І. Працук і У. Пушкін (Паставы), С. Барадаўкін (Гродна), У. Сапяжынскі (Рагачоў), І. Козел (в. Махнавічы Мазырскага раёна), А. Рогач (Вілейка), В. Грабенка (Мінск), А. Кіслы (Узда), Д. Камчыцкі (Магілёў) і А. Агіевіч (Кобрын) убачылі прыватную развязку (2. ba7=) і дадаткова зарабілі па 0,5 ачка.

Аўтар выпраўляе эцюд: белыя — a7, f2 (2), чорныя — c3, h4, дамка h2 (3). 1. ab8 і г. д.

ПІКАНТНЫ ФІНАЛ

Аб выніках чэмпіянату Беларусі па шашках-64 мы паведамілі ў мінулы раз. А цяпер пазнаёмцеся з гульнёй яго прызёраў:



БЕЛЫЯ (А. Валюк): a5, a7, b6, c5, d2, e1, f2, f6, g1 (9). ЧОРНЫЯ (С. Садоўскі): b8, c7, d8, e7, g3, g5, h2, h4, h6 (9). Тут чорныя здолелі замкнуць тры простыя белых (!): 1. ... gf4 2. fe3 3. ed4 gf2! 4. e:e5 hg3 5. dc3 gf2 6. g:e3 gf4 7. e:g5. Далей згуляйце самі.

НАШ ГОСЦЬ

І сёння ён з Узбекістана — Ілья Вальтэр. Яго ўласныя творы, дасланыя ім у рэдакцыю, спадабаюцца вам:

№ 1. БЕЛЫЯ: b2, b4, e3, дамкі d6, f2, f8, g5 (7). ЧОРНЫЯ: a7, b6, дамка g1 (3). Узяць «у палон» дамку і простую чорных: h2 (a5 A) c3, fd6, ge7, db4, b4#. A(c5, b6) c7, c7, e1, c5, c3, c1#.

№ 2. БЕЛЫЯ: a1, a5, d2, d6, e1, f2, f4, h4 (8). ЧОРНЫЯ: a3, b4, c3, f6, f8, g7, h6, h8 (8).

Правядзіце камбінацыю за белых. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

*Віншую дарагога мужа **Уладзіміра Міхайлавіча МЫЧКО** з днём нараджэння! Жадаю моцнага здароўя, шчасця і ўсяго самага добрага.*

Жонка.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (7 ліпеня). На гарызанталі: Гродна. Флёкс. Табун. Ямб. Фрыз. Нуга. Маса. Плыт. Яслі. Заіл. Занепад. Ом. Маяк. Грум. Ізюбр. Гаага. Аграрнік. Азу. Ратна. Туш. Абака. Дэлібаш. Лато. Куфар. Камора. **На вертыкалі:** Карніз. Зімародак. Увал. Апломб. Біла. «Мара». Табар. Антыфрыз. Грукат. Таск. Шашок. Гар. Змяя. Гара. Ёўня. Аспірант. Масла. Угін. Серб. Аід. Макаранка.

Цяпер спявае... міліцыя

На плошчы Свабоды — галоўнай плошчы фестывальнага Віцебска — падчас «Славянскага базару» міліцыя не толькі ахоўвала парадак, але і... спявала.

Вакальна-інструментальны ансамбль УУС Віцебскага аблвыканкама паказаў шматлікім прахожым даволі добры клас творчасці. Цікава, што музыканты і спевакі ў парадной міліцэйскай форме не толькі выканалі творы з традыцыйнага «міліцэйскага рэпертуару», але і шырока вядомыя песні: «Генералы пясчаных кар'ераў», «У краю магнолій», «Мы жадаем шчасця вам» і іншыя. Іх нават выклікалі на біс! Адным з першых гледачоў стаў міністр унутраных спраў Беларусі, генерал-лейтэнант міліцыі Уладзімір Навумаў.

На плошчы таксама працаваў імправізаваны кансультацыйны цэнтр УУС, дзе на пытанні грамадзян адказвалі прадстаўнікі ўпраўленняў: па грамадзянству і міграцыі, ДАІ і кадраў. Побач з гэтай палаткай ДАІ праводзіла конкурс паміж дзецьмі на лепшае ваджэнне веласіпеда і веданне правілаў дарожнага руху. Пераможцы атрымлівалі флікеры, іншыя сувеніры. Праводзіліся экзамены сярод жадаючых здаць на правы матацыкліста.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У ГОМЕЛІ ЗАРЭГІСТРАВАНЫ ЧАЦВЁРТЫ ВЫПАДАК КРАДЗЯЖУ ЛАТАРЭ

«Гаспадар» клапоціцца,

КАБ У БЕЛАРУСКАЙ ГАСПАДЫНІ НА СТАЛЕ БЫЛО ЦЕСНА

Адно з буйнейшых прадпрыемстваў рэспублікі па захоўванню і перапрацоўцы збожжа і самы буйны ў Беларусі вытворца камбікармоў — ААТ «Баранавіцкі камбінат хлебапрадуктаў» паставіў на ўнутраны рынак вялікі набор паўфабрыкатаў для сямейнага ўжытку

«Навінкі ад «Гаспадара»

Хто не любіць хатнюю выпечку? Але ж гэтыя складаныя, заблытаныя рэцэпты... А госці ўжо на парозе! Думаеце, трапілі ў бязвыхаднае становішча?

Выйсце ёсць! «Гаспадар» прапануе вам гатовую мучную сумесь «Залаты Гаспадар», з якой нават кулінар-пачатковец зможа хуценька прыгатаваць выдатны кекс!

Такім чынам, кекс на «раз-два-тры»:

1 Высыпаць змесціва пакета ў глыбокую ёмістасць, заліць вадой і размяшаць.

2 Дадаць маргарын ці масла; разынкі, арэхі, цукаты, ягады — па густу, і выкласці у форму для выпечкі.

3 Паставіць у разагрэтую духоўку.

Праз 30 хвілін кекс гатовы!

Прыемнага апетыту!

ІНТЭГРУЕМ СІСТЭМЫ СТАНДАРТАЎ

Наталля ЛУК'ЯНЧЫК, начальнік аддзела стандартызацыі і сертыфікацыі:

— У свой час кіраўніцтва прадпрыемства прыняло добраахвотнае рашэнне аб распрацоўцы і ўкараненні сістэмы менеджменту якасці на базе міжнародных стандартаў ISO 9001. З адной мэтай — каб палепшыць арганізацыю вытворчасці, адладзіць працэсы. Распрацоўкай і ўкараненнем займаліся самастойна, пры метадычным кіраўніцтве БелГіМа. Па часе гэта заняло прыкладна год, затое сертыфікацыю прайшлі паспяхова. Сёлета адбылася паўторная атэстацыя, дзеянне сертыфіката прадоўжылі яшчэ на тры гады.

Зараз займаемся распрацоўкай і ўкараненнем уласнай сістэмы бяспекі харчовай прадукцыі на базе СТБ 1470 і пашырэннем дзеяння гэтага стандарту на мукамольную вытворчасць і на перапрацоўку свініны. На гэтае лета запланавана і сертыфікацыя па ХАССП.

Сёння больш жорсткімі становяцца патрабаванні па ахове працы і навакольнага асяроддзя, таму летась на прадпрыемстве распрацавана сістэма па кіраванню навакольным асяроддзем. Распрацоўваем і пакет дакументаў па ахове працы.

Кожны з гэтых стандартаў мае свае мэты і накірунку, але сутнасць дакументаў — паляпшэнне работы ўсяго прадпрыемства. У працэсе эксплуатацыі яны «перасякаюцца», узаемадзейнічаюць паміж сабой. І гэтае ўзаемадзеянне павінна быць адладжаным, эфектыўным. Ніхто пакуль ад нас гэтага не патрабуе, але важнасць такой «гармоніі» разумеем самі і ўсур'ёз прыступаем да сінхранізацыі.

Кароткі каментарый Наталлі КАЛЯДКА, намесніка дырэктара па якасці:

— Патрабаванне да высокай якасці працы захоўваецца ў нас на працягу ўсяго вытворчага ланцужка. Існуе ўваходны кантроль за сыравінай, кантроль за ўсімі аперацыямі, выхадны кантроль (у тым ліку лабараторны, на ўсіх важнейшых стадыях). І ў нас фактычна няма праблем з якасцю.

Але не варта разлічваць толькі на кантроль і недаацэньваць чалавечы «фактар». Ва ўсіх вытворчых аперацыях удзельнічаюць жывыя людзі. Калі яны працуюць згодна з патрабаваннямі стандартаў, прадугледжанымі нашай сістэмай менеджменту, то я магу быць спакойнай за якасць прадукту. На ўсіх стадыях вытворчасці стараемся ставіць кадры добра падрыхтаваныя, адказныя. За якасную працу рабочых заахвочваем павышаючым каэфіцыентам да прэміяльных. А зарабіць паніжаючы каэфіцыент нікому не хочацца. У вытворчых падраздзяленнях праводзім «Дні якасці», але стараемся, каб такім днём быў кожны працоўны дзень, кожная змена.

Замест уступу:

«Мы павінны чуць адзін аднаго»

Генеральны дырэктар Наталля МАНЬКО:

— Прадпрыемства наша мае сваю адметнасць — яно пастаянна развіваецца, не стаіць на месцы. І ўсё, што зроблена раней, зроблена з разлікам на перспектыву. Рынак пастаянна патрабуе новых прадуктаў. Ён пачаў падыходзіць да многіх традыцыйных прадуктаў, такіх нават, як мука, нетрадыцыйна, нават выбіральна. Учора гэта была проста мука. А сёння яшчэ больш узраслі патрабаванні да паказчыкаў яе якасці, мяняецца градацыя гатункаў. Раней мы гаварылі: вышэйшы гатунак мукі — калі клейкавіна 28. А зараз той жа вышэйшы гатунак чатырох відаў, з клейкавінай яшчэ і 25, 27 і 29. Яны адрозніваюцца і па белізне. Першага гатунку таксама некалькі відаў. Адсюль фарміруецца і цана на прадукцыю, і яе канкурэнтаздольнасць.

Яшчэ адна тэндэнцыя: на Захадзе ў гандаль паступае гама сумесяў, фактычна напалову гатовых прадуктаў, якія гаспадыня павінна заправіць у форму, даліць ваду і гатаваць. Мы таксама развіваемся ў гэтым накірунку, ёсць пэўныя напрацоўкі, якія мы прапанавалі гандлю. Рыхтуемся правесці рэканструкцыю млына па перапрацоўцы пшаніцы і атрымаць усе тыя прадукты, пра якія я гавару, у большым асартыменце.

Што датычыцца камбікармоў, то тут мы таксама не абыходзімся без «навацый» — напрыклад, без суправаджэння гатовага прадукту і збалансавання з нашай дапамогай кармавых рацыёнаў у гаспадарках. Зможам захаваць свае пазіцыі на рынку толькі тады, калі будзем ведаць патрэбы і запатрабаванні спажыўца і адпавядаць ім. У гэтым плане ідуць тэхналагічныя дапрацоўкі самога працэсу вытворчасці камбікармоў. Раней не заўсёды маглі ўводзіць мікрадабаўкі, якія ўваходзяць у склад камбікорму ў мікраскапічнай прапорцыі, скажам, 0,05 працэнта. Зараз абсталяванне дазваляе гэта рабіць. Можам уводзіць і вадкія кампаненты. Варта мець на ўвазе, што некаторыя віды камбікармоў утрымліваюць да 15 кампанентаў, з маленькім працэнтам уводу, і неабходна дакладна вытрымаць тэхналогію збалансаванага прыгатавання, раўнамернага змешвання, калі мікрадабаўкі ўтрымліваюцца ва ўсёй масе прадукту, а не камячкамі, у асобных яго частках. Бяром на ўзбраенне экспандзіраванне (вільготна-тэрмічная апрацоўка пад ціскам) і экструдзіраванне (тэрмічная апрацоўка) камбікармоў, шалушэнне зерня для іх. Зыходзім з таго, што праўда заўсёды на баку спажыўца, і мы проста павінны даць яму тое, што ён жадае. У першую чаргу для гэтага павінны быць тэхналогіі. Тэхналогіі ёсць.

А пра якасць прадукцыі, я лічу, і гаварыць нават залішне. Прапанаваўшы рынку няякасны тавар сёння, заўтра ты страціш спажыўца і перакрэсліш уласную будучыню. Бо канкурэнцыя дастаткова жорсткая.

За тое, што мы можам яе паспяхова вытрымліваць, я ўдзячна свайму калектыву. Аналіз паказчыкаў работы апошніх гадоў сведчыць, што мы спраўляемся з тэмпамі развіцця і нарошчвання выпуску прадукцыі, з астатнімі паказчыкамі, спраўляемся са сваімі фінансавымі абавязацельствамі. З улікам таго, што прадпрыемства за апошнія тры гады вырасла па колькасці працуючых у тры разы, важна, што змаглі захаваць навыкі і традыцыі галаўнога калектыву і перадаць іх у новыя калектывы, якія ўліліся ў наш склад. Таго ж свінагадоўчага комплексу «Усходні», абодвух сельскагаспадарчых вытворчых участкаў (СВУ). Гэта і ўменне працаваць, і высокая якасць работы, і належная культура вытворчасці. Вось прычыны мая ўдзячнасці і вытокі майго аптымізму.

Аптымізм таксама грунтуецца на веданні тэндэнцый у сельскай гаспадарцы. Камбікармы знаходзяць там усё большае прымяненне. Апраўдана лічыцца, што больш актыўнае і грамотнае іх прымяненне можа ў многім вырашыць праблему кармавой базы для гаспадарак, а значыць, праблему надояў і прывагаў. За камбікармамі будучае, і каб гэтае будучае стала рэальнасцю, патрэбна ўзгодненая работа вытворцы і спажыўца. Яны павінны чуць адзін аднаго, тады будзе добры вынік. Мы за гэта агітуем сваёй штодзённай працай і высокай якасцю сваёй прадукцыі.

Мне прыемна, што найчасцей мы знаходзім агульную мову з кіраўнікамі гаспадарак-партнёраў і мясцовымі ўладамі раёнаў нашай сыравіннай зоны і тых раёнаў, дзе гандлюем сваёй прадукцыяй, і дзякую ім за супрацоўніцтва, разуменне і дапамогу.

Мы ўдзячны Мінгарвыканкаму і персанальна яго старшыні, Міхаілу Якаўлевічу Паўлаву — за тое, што мінчане знайшлі магчымасць перадаць нам у арэнду магазін у сталіцы, на вуліцы Пляханава, 34. Гэта магазін, які гандлюе нашымі мясам і мяснымі прадуктамі, нашай мукой. Там пабудаваны сучасны цэх паўфабрыкатаў, які дапамагае нам перапрацоўваць мяса. Гатовую прадукцыю туды не пастаўляем, завозім у паўтушах, і на месцы рыхтуецца найшырэйшы асартымент свежых паўфабрыкатаў. Магазін адкрыўся 1 студзеня гэтага года, яго калектыў працуе па-сучаснаму, праводзіць прэзентацыі сваёй прадукцыі, і тавараабарот расце з кожным месяцам, што нас радуе. Там прагрэсіўнае абсталяванне, цудоўныя кадры, і заканамерна, што кніга водгукаў запоўнена станоўчымі запісамі. Адным словам, мы працуем для людзей, і людзі нас разумеюць.

«Стараемся мысліць і працаваць па-рынкаваму»

Наступным суразмоўцам журналіста «Звязды» стала намеснік дырэктара па эканоміцы Ірына КАРКОЦКАЯ

— Раскажыце хоць бы коратка пра само прадпрыемства, Ірына Васільеўна.

— Размешчана яно на шасці тэрыторыях. Па-першае, сам камбінат хлебапрадуктаў, які складаецца з мукамольнай і камбікормавай вытворчасці і элеватара. Па-другое, у 2005 годзе да нас далучылі буйны комплекс па вытворчасці свініны «Усходні» Баранавіцкага раёна, на 55 тысяч галоў. Плюс вытворчыя ўчасткі ў Івацэвічах — з падсобнай гаспадаркай па вырошчванню 2 тысяч галоў свіней, і ў Ляхавіцкім раёне. А з 2006 года ў наш склад увайшлі два СВУ ў Баранавіцкім раёне — «Лотвічы» і «Сентябрьский». У суме гэта каля шасці тысяч гектараў зямлі. Так што сёння з 1500 членаў калектыву 860 занята ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Гаспадаркі спецыялізуюцца як на раслінаводстве, так і на жывёлагадоўлі, маюць пяць малочнатаварных фермаў, 1100 галоў буйной рагатай жывёлы. Як бачыце, дзейнасць наша вельмі разгалінаваная.

— І ў той жа час «Баранавічхлебапрадукт» можа працаваць амаль па замкнутаму цыклу?

— У гаспадарках вырасцілі збожжа, перапрацавалі на камбінаце на камбікорм, яго перадалі на комплекс «Усходні» для адкорму свіней. Там функцыянуе і свой цэх перапрацоўкі. Праўда, пакуль невялікі, нам хацелася б мець яго большым, каб перапрацоўваць усю свінину, вырашчаную на комплексе.

Ёсць і свой фірменны гандаль: магазін у Мінску, пра які гаварыла Наталля Віктараўна, і 13 гандлёвых пунктаў у Баранавічах.

— Калі вы не супраць, давайце спынімся на вашай мукамольнай прадукцыі.

— У мукамольнай галіне рэспублікі склаўся лішак магутнасцяў, і таму канкурэнцыя вельмі жорсткая. Каб выжываць, мы павінны мець такую прадукцыю, якая выгадна адрозніваецца па якасці, цане і асартыменту. Значыць, патрэбны новыя яе віды. Так што робім акцэнты на новых відах мукамольнай прадукцыі, бо вымагае жыццё.

Як вядома, гаспадыні нашы — народ эмансіпіраваны, амаль усе працуюць, кухняй ім займацца асабліва няма калі. Таму можна смела сцвярджаць, што будучае — за паўфабрыкатамі. Вось мы і прапануем гаспадыням свае новыя віды прадукцыі — сумесі мучныя, гатовыя да ўжывання: для бліноў, для аладак, для выпечкі кексаў, для выпечкі бісквітаў. Прадукт гатовы, застаецца толькі разбавіць яго малаком ці вадой. А таксама рыхтуем мучныя сумесі для невялікіх кандытарскіх цэхаў і міні-пякарняў, якія таксама ўтрымліваюць увесь набор кампанентаў і не патрабуюць дадатковых затрат працы ці сродкаў.

— Ведаем, што вялікі клопат калектыву — камбікармы...

— Мы заўсёды з гонарам кажам, і гэта адпавядае сапраўднасці, што па аб'ёмах вытворчасці камбікармоў прадпрыемства — першае ў рэспубліцы. Мы самы буйны вытворца камбікармоў нагогул (у месяц выпускаем да 14 тысяч тон) і камбікармоў для птушкі ў прыватнасці. Сказваецца і геаграфічнае месцазнаходжанне прадпрыемства — побач буйныя птушкафабрыкі, нашы даўнія дзелавыя партнёры: птушкафабрыка «Дружба» Баранавіцкага раёна і Баранавіцкая птушкафабрыка. Такое суседства, калі пад бокам знаходзяцца буйныя спажыўцы і калі разам лягчэй адпрацаваць тэхналогіі, дапамагло нам накапіць вялікі вопыт. І сёння да 60 працэнтаў у аб'ёме вытворчасці камбікармоў складаюць менавіта камбікармы для птушак: для бройлераў, для кур-нясушак, нават для розных узроставых груп.

— Але ж вы арыентуецеся не толькі на аптовага спажыўца?

— Выпускаем камбінаваныя кармы і для прыватных падворкаў. З 2001 года актыўна затарваем прадукцыю ў дробную спажывецкую тару, каб рэалізаваць праз рознічную гандлёвую сетку. Зараз у нас — сезон, нават «час пік». Таму затарваем да 3 тысяч тон камбікорму ва ўпакоўку і мяхі — пачынаючы ад аднаго кілаграма і канчаючы 30 кілаграмамі (2 кг, 3,5 кг, 10 кг, 20 кг). Так, як просяць пакупнікі.

Каб наблізіць сваю прадукцыю да вясковага пакупніка, стварылі сетку дыстрыб'ютараў, якія працуюць на тэрыторыі свайго сельсавета, маюць у наяўнасці поўны асартымент нашай прадукцыі і могуць развезці тавар у кожны падворак. За сваю працу атрымліваюць ўзнагароджанне ў працэнтах ад выручкі. Дыстрыб'ютарская сетка стваралася з ведама мясцовай улады, фарміравалася дастаткова доўга, пакуль знайшлі падыходзячых людзей, якія жадаюць і могуць працаваць, навучылі іх, у тым ліку і ўменню граматна праінфармаваць патэнцыяльнага пакупніка. У іх ёсць адпаведныя ліцэнзіі на права гандлю, а таксама рэкламныя матэрыялы, і яны здатныя не толькі прадаць тавар, але і расказаць, як яго правільна выкарыстоўваць. Зараз у нас 60 такіх памочнікаў, з іх дапамогай прадаём насельніцтву ў сезон да 20 працэнтаў камбікармоў. Аналіз паказвае, што рынак прыватнага спажывання (я маю на ўвазе насельніцтва) асвоены намі ў сваёй зоне працэнтаў на 40, і працаваць ёсць над чым.

— Чым вы яшчэ гандлюеце, акрамя камбікорму для птушак?

— Камбікармамі, кармавымі сумесямі і дабаўкамі для буйной рагатай жывёлы і яе маладняку, для свіней, як я гаварыла, і парасят — розных відаў, для падкормкі хатняй жывёлы. Карыстаецца попытам камбікорм для рыб і для трусоў. Укараняем асартыментныя навінкі, у тым ліку камбікорм для сабак, і даволі паспяхова рэалізуем яго ў сваім рэгіёне. (А за асноўным нашым прадуктам — камбікормам для птушкі — едуць да нас з усёй рэспублікі). Недзе 80 працэнтаў камбікармоў ідзе на суседнія птушкафабрыкі і нашы уласныя падраздзяленні. За намі замацаваны канкрэтныя раёны Брэсцкай вобласці, пра іх таксама клапоцімся, як пра сябе.

— Дарэчы, прычына папулярнасці прадукцыі мясаперапрацоўкі прадпрыемства — у высокай якасці вашых жа камбікармоў?

— Я ў прынцыпе згодна, але яшчэ сказала б, што наша перавага заключаецца і ў наступным: у прадуктах мясаперапрацоўкі абсалютна не выкарыстоўваем аніякіх дабавак, яны ў нас цалкам натуральныя. Таму нам і не хапае магутнасцяў цэха, каб задаволіць усе заяўкі. Цэх выпускае ў дзень каля двух тон прадукцыі, гэта невялікі аб'ём, 60 тон у месяц, і ўся гэтая прадукцыя ідзе ў магазіны нашага горада Баранавічы. Існуе попыт і на значна большую колькасць прадукцыі, менавіта таму стаіць пытанне аб пашырэнні магутнасцяў цэха. З пункту гледжання рэнтабельнасці таксама больш выгадна перапрацаваць мяса ў сябе, гэта станоўча адбіваецца і на цане.

— Што ж, у вас ёсць і база для нарошчвання магутнасцяў: комплекс «Усходні», два СВУ...

— Абодва калгасы ўвайшлі ў наш склад параўнальна нядаўна, крыху больш за год. Патрэбна ўкладваць сур'ёзныя сродкі ў іх развіццё: у набыццё тэхнікі, угнаенняў, сродкаў абароны раслін, у рэканструкцыю фермаў. Мы паднялі там заработную плату. Вельмі спадзяёмся, што ўсё гэта ў выніку прынясе свой плён, і наша прадпрыемства будзе шматпрофільным, высокапрадукцыйным, эканамічна моцным.

Каб наблізіцца да гэтай мэты, стварылі буйны аддзел маркетынгу, у якім працуе паўтара дзесятка маладых, энергічных спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Асобна выдзелены тэхнолаг у аддзеле маркетынгу займаецца разлікам рэцэптуры і ўзгадненнем яе са спажыўцом. Па жаданню заказчыка можам уносіць у склад рэцэптур любыя змяненні, у межах дазволенага тэхнічнымі ўмовамі, з выкарыстаннем патрэбных арганізму жывёлы дабавак. Існуе сучасная праграма разліку рэцэптур для жывёлы з улікам яе фізічнага стану і кармавой базы канкрэтнага СВК, і з шэрагам гаспадарак мы супрацоўнічаем. Гэта даволі перспектыўны накірунак работы.

Мы ўсё больш упэўнена адчуваем сябе на ўмовах рынку. Стараемся мысліць і працаваць па-рынкаваму.

Па прынцыпу дыстрыб'ютарскай сеткі, якая рэалізуе камбікармы, ствараем дылерскую сетку па продажу мукі. І ў нас ужо ў кожным абласным цэнтры ёсць уласны дылер, які займаецца пошукам кліентаў, зборам заявак на прадукцыю і заключэннем дагавораў. Гэта, а таксама ўдзел у выстаўках і растлумачальная работа праз сродкі масавай інфармацыі, дало вынік, мы значна пашырылі рынкі збыту.

Калі складваецца спрыяльная для нас кан'юнктура знешняга рынку, нейкую частку сваёй прадукцыі адпраўляем на экспарт. Зараз ёсць попыт на пэўныя гатункі мукі, экспартуем яе ў Расію і ва Украіну.

Навінкі ад «Гаспадара»

Ваша маці лепш за ўсіх на свеце пячэ пышныя і румяныя аладзейкі, а ў вас так не атрымліваецца? Зараз абавязкова атрымаецца!

«Гаспадар» прапануе вам навінку — гатовую мучную сумесь для аладак. Вось убачыце: ваша мама папросіць у вас рэцэпцік!

Такім чынам, аладзейкі на «раз-два-тры»!

1 Высыпаць змесціва пакета ў міску.

2 Наліць вады і добра размяшаць.

3 Выпякаць на разагрэтай патэльні.

Прыемнага апетыту!

Млын-вятрак нам толькі сніцца...

Галоўны інжынер прадпрыемства Аркадзій НЕСЦЯРОВІЧ:

— Сімвалам нашай галіны некалі быў млын-вятрак, але часы мяняюцца, на ўзбраенні вытворцаў зараз новае, высокапрадукцыйнае абсталяванне. На сваёй мукамольнай вытворчасці летась пачалі і сёлета завяршылі рэканструкцыю млына жытняга памолу. Млынам кіруе камп'ютар, вытворчасць тут аўтаматызаваная. Камп'ютар сочыць і за тэмпературным рэжымам на элеватары, а новыя вагі-аўтамат дазволілі цалкам аўтаматызаваць узважванне збожжа. На камбінаце ўкаранёна лакальная камп'ютарная сетка, якая цалкам замкнула на сабе і аперацыі па ўліку пры прыёмцы сыравіны, пры перамяшчэнні прадукцыі ўнутры камбіната, яе адгрузцы.

Шмат новага высокапрадукцыйнага абсталявання ўкаранёна на камбікормавай вытворчасці, тут паўнапраўным гаспадаром таксама адчувае сябе камп'ютар. Праведзена аўтаматызацыя цэха рассыпных камбікармоў. На цэху гранулявання зманціравана і пушчана лінія экспандзіравання і гранулявання камбікармоў прадукцыйнасцю 8—10 тон у гадзіну. Зараз набылі яшчэ адну такую лінію, прадукцыйнасцю ўжо 20 тон у гадзіну. Яе наладка і пуск дазволяць грануляваць практычна ўсе рассыпныя камбікармы, што вельмі даспадобы спажыўцам.

У планах будаўніцтва зернясховішча на 20 тысяч тон, якое павінна акупіцца ўсяго за два з паловай гады. Аб'яўлены конкурс на рэканструкцыю млына трохгатунковага пшанічнага памолу. Прадугледжаны шэраг іншых даволі буйных тэхнічных мерапрыемстваў, якія, безумоўна, прынясуць карысць.

Навінкі ад «Гаспадара»

«Зярнятка здароўя».
Пшаніца для прарошчвання.

Праросшыя зярняты багаты на амінакіслоты, вітаміны В, Н, b-карацін, макра- і мікраэлементы, раслінныя валокны. Яны садзейнічаюць выдаленню з арганізма таксінаў, канцэрагенаў, радыенуклідаў, алергенаў, стымулююць перыстальтыку кішэчніка і працэсы зажыўлення, звязваюць і выводзяць з арганізма лішкі халестэрыну, павялічваюць працаздольнасць і нават тармозяць працэсы старэння.

Рэцэпты прыгатавання чытайце на ўпакоўцы!

Па працы і пашана

ДАЛЁКА НЕ ПОЎНЫ ПЕРАЛІК УЗНАГАРОД ПРАДПРЫЕМСТВА

2004 год — дыпломы лаўрэата конкурсу «Лепшыя тавары РБ», лаўрэата конкурсу «Прэмія Урада РБ за дасягненні ў галіне якасці», рэспубліканскага конкурсу прадуктаў харчавання «Прадукт года 2004», за удзел у міжнароднай выставе «Белагра-2004».

2005-ы — Залаты знак «Усерасійская марка (III тысячагоддзе). Знак якасці XXI стагоддзя», дыпломы за актыўны ўдзел у міжнароднай выставе «Белагра-2005», за ўмацаванне і пашырэнне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва (10-я Усерасійская выстаўка-ярмарка «Рэгіён Расіі»), за шырокі асартымент прадукцыі на XI міжнароднай выставе-кірмашу «ПРАДЭКСПА 2005», за ўдзел у рэспубліканскім конкурсе прадуктаў харчавання «Прадукт года 2005».

2006-ы — залаты, срэбны і плацінавы знакі і ганаровы дыплом удзельніка міжнароднай выставы-конкурсу «Усерасійская марка (III тысячагоддзе). Знак якасці XXI стагоддзя», ганаровая грамата за актыўны ўдзел у «Беларускім аграпрамысловым тыдні», дыплом лаўрэата конкурсу «Лепшыя тавары РБ» і іншыя ўзнагароды.

Радкі з кнігі водгукаў

«Праўленне СВК «Агракамбінат Сноў» выказвае ўдзячнасць калектыву ААТ «Баранавіцкі камбінат хлебапрадуктаў» за якасныя камбікармы, чулыя адносіны да запатрабаванняў спажыўца і своечасовае выкананне заявак, што дазваляе выконваць праграму кармлення і дабівацца добрых вытворчых паказчыкаў у птушкагадоўлі. Старшыня праўлення Н.В. Радаман».

«Прадукцыя, зробленая з вашай мукі, карыстаецца вялікім попытам у насельніцтва. Дырэктар Ляхавіцкага каапрама Г.Н. Якубец».

Побач — удзячныя запісы ад дырэктара птушкафабрыкі «Дружба» Баранавіцкага раёна В.П. Маркевіча, начальніка цэнтральнай вытворча-тэхнічнай лабараторыі мясцовага хлебазавода і іншых спажыўцоў і дзелавых партнёраў.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Апаратчык мукамольнай вытворчасці Ірына ШАРКЕЛЬ.
2. На варце якасці — работнікі вытворча-тэхнічнай лабараторыі.
3. Алег КАРЧЭЎСКІ з таварышамі корміць жыхароў сталіцы «дзедаўскай» каўбаскай.
4. Усе паўфабрыкаты вырабляюцца ў цэху пры магазіне. З задавальненнем дэманструюць гэтую смакату прадаўцы Наталля МЯДЗВЕДКА і Валянціна ШАЛАЙ.

Публікацыю падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ. Здымкі Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і з архіва прадпрыемства.

У магазіне на Пляханава, 34

ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА!
ААТ «Баранавічхлебапрадукт»
225406, Рэспубліка Беларусь,
Брэсцкая вобл., г. Баранавічы,
вул. 50 гадоў БССР, 21.
Тэл. (80163) 42-33-97 — прыёмная,
41-76-63 — нам. дырэктара па эканоміцы і маркетынгу,
41-76-68 — аддзел маркетынгу,
41-67-96 — камерцыйны аддзел.
e-mail: marketkhp@tut.by

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.188. Індэкс 63850. Зак. № 3793. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12